Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я  Г А З Е Т А

14 ЛІСТАПАДА 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 215 (26328)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## НА ВЫХАДНЫЯ — ДАЖДЖЫ ПЛЮС МОЦНЫ ВЕЦЕР, А Ў ПАНЯДЗЕЛАК — ПЕРШЫ СНЕГ

**Сёння ў асобных раёнах пройдуць невялікія дажджы, у першай палове дня туман, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Тэмпература паветра ў пятніцу 1—7 цяпла. У выхадныя ўначы па паўночным захадзе, а ўдзень паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы. У суботу ўначы ў асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы ад 2 марозу да 4 цяпла, удзень — плюс 2—8 градусаў, па захадзе да 10 цяпла. У нядзелю зноў чакаюцца дажджы, удзень па поўначы краіны — мокры снег, месцамі ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы 1—7, удзень 3—9 цяпла. У пачатку наступнага тыдня істотна пахаладае і чакаецца першая рэпетыцыя зімы, калі праз тэрыторыю краіны пачне рухацца халоднае і вільготнае арктычнае паветра. У панядзелак чакаюцца ападкі пераважна ў выглядзе мокрага снегу, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень 0—5 цяпла. У аўторак месцамі, а ў сераду паўсюдна мокры снег. На дарогах сур'ёзная галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да 6 марозу, удзень мінус 3 — плюс 3.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «КАРУПЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ ВЫКАРАНЯЦЦА САМЫМ ЖОРСТКІМ ЧЫНАМ»

**Аб гэтым Прэзідэнт заявіў на нарадзе па пытаннях эфектыўнасці прымаемых мераў у барацьбе з карупцыяй.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, нягледзячы на тое, што агульная колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў змяншаецца, хабарніцтва расце. Павялічваецца маштаб матэрыяльнага ўрону ад карупцыйных дзеянняў, а ўзровень яго кампенсацыі скарачаецца.

У сферы дзяржаўнага кіравання толькі за 10 месяцаў гэтага года колькасць карупцыйных злачынстваў склала 347. З іх 104 учынены супрацоўнікамі органаў унутраных спраў, дзяржбяспекі, фінансавых расследаванняў, Міністэрства абароны, Дзяржаўнага пагранічнага і Дзяржаўнага мытнага камітэтаў.

«Гэта толькі тое, што выявілі! Гэта вельмі трывожныя тэндэнцыі. Яны сведчаць аб тым, што эфектыўнасць барацьбы з карупцыяй зніжаецца. Не ўсе структуры, прызначаныя быць на варце інтарэсаў дзяржавы і грамадзян, працуюць рэзультатыўна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, прычына такога становішча ў безадказнасці і самазаспакоенасці.

«Дзейнасць па папярэджанні карупцыйных праяў не можа абмяжоўвацца асобнымі акцыямі і кампаніямі. Калі мы хочам дабіцца рэальных вынікаў, у краіне павінна быць створана антыкарупцыйная атмасфера», — перакананы беларускі лідар.

«Паводле майго глыбокага перакanання, менавіта карупцыя стала адной з асноўных прычын цярпашняга сусветнага крызісу. Таму барацьба з ёй патрэбна маштабная. Мы вельмі цяжка ішлі да самастойнасці і незалежнасці нашай дзяржавы, каб дзеля злачынага дабрабыту асобных нячыстых на руку дзеячаў разбурыць тое, што далося цаной напружанай і няспыннай працы простых людзей!» — падкрэсліў Прэзідэнт.

У Беларусі расцягвання дзяржаўнай уласнасці, рэсурсаў і «прыхватызацыі» не будзе, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар асабліва адзначыў, што, лібералізуючы эканоміку, нельга ні ў якім выпадку аддаваць яе ў рукі жулікаў і прайдзісветаў.

«У гэты няпросты перыяд Беларусь заявіла аб лібералізацыі сваёй эканомікі, і некаторыя дамарослыя апазіцыянеры паспяшаліся заявіць аб тым, што нібыта набліжаецца наменклатурная прыватызацыя і што, маўляў, усе «смачныя кавалкі» дзяржуласнасці падзелены ўжо паміж карумпаванымі чыноўнікамі. Супакойцеся, паны! Устараненне бюракратычных перашкод, лібералізацыя робіцца не пад чыноўнікаў, а хутчэй наперакор іх жаданням. Мы ніколі не дапусцім якой-небудзь наменклатурнай прыватызацыі і перараэмеркавання прыналежных народу багацццяў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Ад карупцыі мы будзем ачышчаць нашу дзяржаву бязлітасна. Выніковасць нашых намаганняў праяўляецца ў момант выпрабаванняў. Гэтым людзям (карупцыянерам) фінансавыя і эканамічныя крызісы — усё роўна і працаваць на дзяржаву яны не будуць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, у цяперашніх умовах асабліва актуальнымі становяцца максімальна строгая дысцыпліна, беражлівае стаўленне да народнага багацця і да тых нешматлікіх рэсурсаў, якія мае Беларусь, а таксама істотная эканомія.

Карупцыя ў Беларусі будзе выкараняцца самым жорсткім чынам, заявіў Прэзідэнт.

«Абурае карупцыя, якая разрастаецца сярод тых, хто па абавязку службы павінен з ёй змагацца. У хабарніцтве, іншых карыслівых дзеяннях аказваюцца замешанымі прадстаўнікі сілавых структураў, якія павінны прадухіляць і спыняць гэтыя злачынныя з'явы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Папярэджваю ўсіх: у Беларусі такога бязмежжа не будзе! Нават у фрагментарным парадку. Прынамсі, пакуль я Прэзідэнт. Не пагляджу ні на пасады, ні на чыны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, такія дзеянні — ганьба не толькі для канкрэтнага чалавека або адпаведнага дзяржаўнага органа, «гэта нязмыўная пляма на рэпутацыі ўлады ў цэлым». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна дакладна ўяўляць, што карупцыя — гэта пагроза палітычнай і эканамічнай бяспецы краіны, поўнае разлажэнне дзяржаўнага апарату, абсалютная страта кіравання эканамічным сектарам і тормаз на шляху станаўлення прававой сацыяльнай дэмакратычнай дзяржавы.

«Да чаго ж мы дойдзем, калі барацьбой з карупцыяй займаюцца людзі, якія самі парушаюць законы і нормы маралі? Што можна чакаць ад дзяржаўных органаў, упаўнаважаных выконваць кантрольныя і наглядныя функцыі, калі іх супрацоўнікі прымаюць ад правяраемых «адкупныя»? — задаў рэзоннае пытанне Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яго сур'ёзна насцярожвае і тое, калі людзі ў пагонах робяць учынкі, якія, калі паглядзець фармальна, юрыдычна дапушчальныя. «Але настолькі несумленныя з маральнага пункту гледжання, што іх нельга апраўдаць! Гэта значыць у заканадаўстве вышукваюць праласы, каб зрабіць тое, да чаго прычыняцца не павінны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён прывёў канкрэтныя факты карупцыі ў Міністэрстве абароны, сярод пракурорскіх работнікаў. «Пракурорскі работнік за бясцэнак купляе ў камерсанта вельмі камфартабельную кватэру з падземных гаражом. Усё быццам бы законна, купіў і купіў. Але няўжо не ўзнікаюць насцярожваючыя думкі: чаму бізнэсмен прадаў пракурору кватэру танней, чым яна рэальна каштуе, і дзе гэты пракурор узяў такія грошы», — сказаў Прэзідэнт.

Ёсць і прыклад, калі пад дачы быў адведзены ўчастак у прыродаахоўнай зоне, прыналежны дзіцячаму садку.

«Пратэкцыянізм фірмаў, лабіраванне атрымання ліцэнзій, квот, дазволаў, закрыццё крымінальных спраў адносна «сваіх бізнэсменаў» і заказныя справы супраць іх канкурэнтаў. Вы што, не чуеце, аб чым гавораць людзі і якія злоўжыванні выяўляюцца?» — звярнуўся Прэзідэнт да прысутных.

У краіне за гэтыя гады зроблена ўжо нямала, каб спыніць найбольш небяспечныя праявы карупцыі: не дапушчана масавае раскраданне дзяржмаёмасці, у законы ўключаны жорсткія меры процідзеяння карупцыі. Аднак, падкрэсліў Прэзідэнт, няма падстаў для таго, каб супакоіцца і аслабіць барацьбу з гэтым злом.

Прэзідэнт Беларусі даручыў генеральнаму пракурору да канца дня ўнесці прадстаўленне аб вызваленні ад займаемых пасадаў намесніка генпракурора Мікалая Купрыянава і пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра. Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў узбудзіць крымінальную справу.

У маі 2007 года пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір набыває 5-пакаёвую кватэру ў цэнтры Мінска плошчай больш як 200 кв.м з падземным гаражом. «Першае пытанне: дзе ўзяў грошы?» — абураўся Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што Міхаіл Снягір купляў гэту кватэру ў прадстаўніка камерцыйнай фірмы — у чалавека, які на гэты момант не меў права прадстаўляць гэту фірму і нагоул быў звольнены па скарачэнні штатаў.

Акрамя таго, названая кватэра не магла быць прададзена юрыдычнай асобай, паколькі ў ёй праживаў супрацоўнік фірмы Сідаровіч, у якога быў заключаны дагавор арэнды да 2024 года.

Прэзідэнт таксама паведаміў, што кватэра была набытая Міхаілам Снегіром па заніжанай цане Br156 млн, пры гэтым рыначны кошт яе быў больш як $500 тыс. Каб надаць здзелцы выгляд законнасці, Снягір аформіў падложнае дадатковае пагадненне да дагавора куплі-продажу, дзе была агаворана іншая цана кватэры — Br535 млн.

«Калі Сідаровіч, які пражываў у кватэры, звярнуўся ў суд Цэнтральнага раёна Мінска, то якую, вы думаеце, пазіцыю занялі суддзі: Ільіна, Есьман, Паўлючук?.. Суддзя Ільіна ўзгадняла па тэлефоне са Снегіром паслядоўнасць сваіх дзеянняў», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым суддзі Есьман і Паўлючук прынялі рашэнне накласці спагнанне на наймальніка кватэры за нібыта самавольную перапланіроўку кватэры.

Наймальнік Сідаровіч 8 разоў звяртаўся у Генеральную пракуратуру са скаргай на супрацьпраўныя дзеянні пракурора Снегіра. «І што вы думаеце?.. — Ніякага адказу!» — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. «Таму што ўсе дакументы спісваліся са справы намеснікам генпракурора Мікалаем Купрыянавым, які быў са Снегіром у сяброўскіх адносінах», — дадаў ён.

«Але гэта яшчэ не ўсё, — абурыўся Прэзідэнт. — На тэрыторыі Цнянскага вадасховішча Снягір завяршае будаўніцтва катэджа, кошт якога, толькі паводле візуальных ацэнак, складае не менш як $1 млн. Грошы адкуль? Я свядома ў дэталях распісваю гэтыя махінацыі, каб паказаць тую ступень беспардоннасці і нахабнасці, да якой дакаціліся некаторыя высокапастаўленыя работнікі судовай і праваахоўнай сістэм», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што гэты катэдж, які выглядае больш унушальна, чым рэзідэнцыя кіраўніка дзяржавы, быў зарэгістраваны Міхаілам Снегіром на падстаўную асобу. «І яшчэ адзін штрых характарыстыкі пракурора вобласці, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Да яго звярнуліся сябры-прадпрымальнікі з просьбай аб аказанні садзейнічання ва ўстараненні канкурэнта і адмене прынятага ўжо рашэння Вышэйшага гаспадарчага суда. Тут Снягір праявіў незвычайную актыўнасць». Калі з-за прынцыповай пазіцыі першага намесніка старшыні ВГС Яўгена Смірнова Міхаілу Снегіру не ўдалося вырашыць гэта пытанне, то, паводле слоў Прэзідэнта, Снягір звярнуўся па дапамогу да намесніка генпракурора Купрыянава, а той у парадку пракурорскага нагляду прыпыніў выкананне рашэння суда.

«Вось вам некалькі яскравых прыкладаў, якую сістэму кругавой паруки і ўсёдазволенасці стварылі некаторыя высокапастаўленыя асобы дзяржаўных органаў», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. «Па логіцы гэтага ж Снегіра і да яго падобных атрымліваецца: у каго больш правоў — той можа рабіць як уздумаецца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Не выйдзе!».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем канстатаваў, што ў краіне не створана сістэма належнага ўзаемадзеяння паміж органамі, якія вядуць барацьбу з карупцыяй. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу дзяржсакратарыяту Савета Бяспекі безадкладна заняцца гэтай праблемай і ўзмацніць каардынацыю гэтых структур.

«У раз'яднаным стане мы ніколі не дасягнём эфектыўнасці ў барацьбе з карупцыяй», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў галіне барацьбы з карупцыяй ёсць некалькі праблемных пытанняў. Паводле яго слоў, у праваахоўных органаў адсутнічаюць належныя напрацоўкі па выяўленні карупцыйных злачынстваў у найбольш значных сферах дзейнасці: бюджэтнай, энешнеэканамічнай, энергетычнай, нафтахімічнай, аўтамабільнай і іншых. Не ў поўнай меры праводзіцца аналіз фінансава-гаспадарчай дзейнасці высокадаходных прадпрыемстваў, на належным узроўні не адсочваюцца працэсы, звязаныя з прыватызацыяй і акцыянаваннем. На думку Прэзідэнта, бачна нядзольнасць адэкватна рэагаваць на сучасныя больш вытанчаныя факты карупцыі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў наяўнасць сур'ёзных недахопаў у аператыўным складальніку дзейнасці праваахоўных органаў па выяўленні і раскрыцці злачынстваў. «На практыцы шматлікія аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы заварашоцца безвынікова. Для аператыўных службаў праваахоўных органаў характэрна і адсутнасць мэтанакіраванай працы, праяўленне актыўнасці толькі на першапачатковым этапе, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Заявілі аб гучнай справе, а к канцу яна ў вас рассыпаецца з-за недаказанасці».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на абгрунтаванасць прымянення аператыўнага эксперыменту, які, паводле яго слоў, усё больш ператвараецца з прававога інструмента ў прыладу правакацыі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўнай задачай павінна быць выяўленне злачынцаў, а не падбухторванне да ўчынення злачынстваў.

Першачарговую ўвагу трэба надаць кадравай чысціні дзяржаўнага апарату, яго юрыдычнай, маральнай сумленнасці, заявіў Прэзідэнт. Ён даручыў Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы істотна палепшыць работу па падборы і расстаноўцы кадраў. «Трэба зрабіць так, каб у чыноўнікаў не было не толькі ўмоў, але і падстаў для карупцыйнай дзейнасці», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што неабходна распрацоўваць і ўкараняць новыя метады работы, якія даюць магчымасць быць не ў хвасце падзей, а наносіць папераджальныя ўдары па рэальнай карупцыі, не па дробязях. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што праваахоўныя органы павінны самі быць прыкладам пры расследаванні карупцыйных крымінальных спраў.

Як заявіў Аляксандр Лукашэнка, на працягу лістапада будзе звольнены шэраг высокапастаўленых чыноўнікаў МУС Беларусі.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, 10 высокапастаўленых службовых асобаў МУС наўмысна пайшлі на парушэнні заканадаўства, каб атрымаць зямельныя ўчасткі ў Мінскім раёне. «Я назаву ўсе гэтыя прозвішчы да ведама: першы намеснік міністра Аляксандр Шчурко, намеснік Віктар Філістовіч, былыя намеснікі Радзюкевіч і Глухоўскі, начальнік дэпартамента фінансаў і тылу Мельнікаў, дырэктар Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Іванчыкава, былы начальнік дэпартамента выканання пакаранняў Коўчур, былы саветнік міністра ўнутраных спраў Карпейчык, урач Шпіталя МУС Бурко і супрацоўнік ГУУС Мінгарвыканкама Новік», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што для будаўніцтва асабнякоў гэтыя чыноўнікі падабралі сабе тэрыторыю летняй дачы дзіцячага садка, размешчанай у водаахоўнай зоне Заслаўскага вадасховішча. Пад выглядам дачнага кааператыва, якога насамрэч ніколі не было, яны пабудавалі жылы масіў з двух- і трохпавярховых будынкаў. «Выкарыстоўваючы службовае становішча і маніпуліруючы заканадаўствам, супрацоўнікі МУС сталі амаль задарма ўласнікамі зямельных участкаў. «Вартавыя парадку» заплацілі за іх ад Br10 тыс. да Br25 тыс.», — адзначыў Прэзідэнт.

«Калі гэтыя факты сталі вядомыя, я даручыў КДК і генеральнаму пракурору разабрацца ва ўсім і ўстараніць выяўленыя парушэнні, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я чакаў, што гэтыя органы навядуць такі парадак, каб іншым непанадна было». Замест гэтага, паводле слоў Прэзідэнта, «кантралёры маўкліва самаўхіліліся». «Што ж, калі больш няма каму, то аднаўляць справядлівасць давядзецца мне», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым запатрабаваў ад старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леаніда Крупца на працягу тыдня адмяніць незаконнае рашэнне Мінскага райвыканкама аб прадастаўленні зямельных участкаў былым і цяперашнім супрацоўнікам МУС. Узведзеныя там збудаванні з'яўляюцца самавольнымі. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў адабрацъ зямельныя ўчасткі і перадаць іх для размяшчэння дамоў сямейнага тыпу для дзяцей-сірот. Былым уласнікам будуць дадзены тры месяцы, каб яны знеслі свае пабудовы. Калі яны іх не знясуць, то пабудовы павінны быць бязвыплатна адабраны пад дамы для дзяцей-сірот.

«Дзяржсакратару Савета Бяспекі Юрыю Жадобіну сумесна з Генпракуратурай і КДК неабходна ў месячны тэрмін прадставіць заключэнне аб адпаведнасці займаемым пасадам усіх асобаў, якія маюць дачыненне да названых парушэнняў заканадаўства», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Магу канкрэтызаваць: усе гэтыя людзі на працягу лістапада павінны быць звольнены з МУС», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзіміру Макею даручана да канца лістапада ўнесці прапановы па пакаранні вышэйшых службовых асобаў, якія не прынялі своечасовыя меры па спыненні гэтых правапарушэнняў.

З 1 студзеня 2009 года рашэнне аб змякчэнні пакарання адносна асуджаных за карупцыйныя злачынствы супрацоўнікаў праваахоўных органаў будзе прымаць выключна Прэзідэнт, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Асуджаныя супрацоўнікі праваахоўных органаў будуць адбываць пакаранне ў найгоршых калоніях з закаранелымі злачынцамі, дадаў Прэзідэнт.

У ходзе нарады кіраўнік дзяржавы закрануў і пытанні эканамічнага развіцця краіны. Беларусь ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу павінна не проста выстаяць, але і захаваць тэмпы развіцця, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы павінны экспартаваць прадукцыю. Расказы і казкі аб тым, што ў спажыўцоў няма грошай і за гэтага прадукцыю немагчыма рэалізаваць, не патрэбны. Сёння дастаткова спажыўцоў на замежных рынках, якія могуць купіць нашу прадукцыю», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў няўхільнага выканання трох дзеючых у Беларусі дырэктыў: па дэбюракратызацыі, эканоміі і беражлівасці, дысцыпліне. «Патрабаванне павінна быць самае жорсткае. У гэтым напрамку павінны быць прыняты жалезныя меры. Пры гэтым трэба мець на ўвазе: рамкі сусветнага эканамічнага крызісу ніхто сёння акрэсліць не можа. Таму наводзьце жорсткую дысцыпліну, узмацняйце беражлівасць і эканомію», — сказаў Прэзідэнт.

Беларускі лідар запатрабаваў яшчэ раз з улікам існуючай сітуацыі грунтоўна прааналізаваць работу з кадрамі, каб зрабіць яе «максімальна адкрытай і зразумелай», заснаванай на здаровай канкурэнцыі здольнасцяў і кампетэнтнасці прэтэндэнтаў.

«Базавы прынцып нашай палітыкі — дзяржава для народа. І дзеля дасягнення гэтай мэты я не адступлюся ад рашучай барацьбы з карупцыяй — іржой, якая можа ўцягнуць краіну ў бездань эканамічных і сацыяльна-палітычных узрушэнняў. Тут першараднае значэнне маюць самыя жорсткія патрабаванні да сумленнасці і прыстойнасці кадраў. Асабліва да тых, хто па абавязку службы стаіць на варце закона і дзяржавы. Людзі ў пагонах павінны ў сто разоў больш клапаціцца аб чысціні сваіх радоў у параўнанні з астатнімі чыноўнікамі. Таму што толькі чыстымі рукамі можна наводзіць у краіне парадак», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Я ўжо неаднаразова гаварыў: бюракратызм — самае спрыяльнае асяроддзе для росквіту карупцыі. Арэнда гандлёвых памяшканняў, правядзенне тэндараў, выдзяленне зямельных участкаў, ліцэнзаванне відаў дзейнасці, розныя праверкі — гэта далёка не поўны пералік актыўных карупцыйных зон, якія патрабуюць асаблівай увагі. Парадак вырашэння гэтых пытанняў павінен быць такі, каб ад чыноўніка нічога не залежала. Тады яму не будзе за што даваць хабар», — лічыць Прэзідэнт.

Ён таксама асабліва адзначыў, што людзі вераць уладзе, і дзяржава «не можа ставіцца да людзей інакш, як з такім жа даверам і павагай».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАМЕЖНІКІ ХАБАР НЕ ЎЗЯЛІ

**13 300 расійскіх рублёў хабару спрабаваў даць вайскоўцу Гомельскага пагранічнага атрада адзін бізнэсмен з Расійскай Федэрацыі за станоўчае вырашэнне яго пытання.**

Але той не пайшоў на здзелку з сумленнем і паступіў так, як гэтага патрабуе закон. І вось вынік: гэтымі днямі суд Гомельскага раёна вынес прыгавор, згодна з якім расіянін пазбаўлены волі на два з паловай года калоніі ўзмоцненага рэжыму. Такая ж мера пакарання была вызначана гэтым жа судом у дачыненні да двух грамадзян Малдовы, якія таксама спрабавалі даць хабар памежнікам на мытным пераходзе «Новая Гута».

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### ІЛЬГОТНЫ РЭЖЫМ УВОЗУ ТАВАРАЎ З РАСІІ ПРАДОЎЖАНЫ НЕ БУДЗЕ

**З 1 студзеня 2009 года ў Беларусі будуць адменены прэферэнцыі, якімі індывідуальныя прадпрымальнікі карысталіся пры ўвозе тавараў з Расійскай Федэрацыі, паведаміў намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй ТУР.**

«Мытнае афармленне тавараў, увозімых ІП з Расіі, будзе ўведзена з 1 студзеня, цяперашні льготны рэжым прадоўжаны не будзе, — сказаў Андрэй Тур. — Гэта робіцца для таго каб, у першую чаргу, забяспечыць аднолькавыя канкурэнтныя ўмовы дзейнасці для ўсіх суб'ектаў гаспадарання. Сёння прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы праводзяць мытнае афармленне ўвозімага з Расіі тавару ў поўным аб'ёме, а ІП з супастаўным тавараабаротам абыходзяцца без мытнага афармлення».

**БЕЛТА.**

### ГРАНАТЫ БЫЛІ, АЛЕ...

**У школе №19, што ў Баранавічах, падняўся вялікі перапалох, калі сямікласнік паведаміў, што ў знаёмага пяцікласніка ў партфелі гранаты.**

Педагог дапрызыўнай падрыхтоўкі аднёс той партфель далей ад школы і выклікаў супрацоўнікаў спецслужбаў. Было ўстаноўлена, што гранаты вучэбныя, якія падлетак «свіснуў» у бацькі, а той у свой час прынёс іх са службы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### СУСТРЭЛІСЯ ДЗЯЎЧЫНКІ...

**У Пінску на вул. Цэнтральнай да 10-гадовай вучаніцы падышлі дзве невядомыя і забралі ў яе залатыя завушніцы.**

Пазней, пасля звароту ў міліцыю маці пацярпелай, было ўстаноўлена, што рабаванне ўчыніла вучаніца 9-га класа з напарніцай — апошнюю шукаюць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Парламенцкі дзённік

## ЗНЕШНЯЕ КОЛА

*Дэпутаты вызначыліся з прадстаўніцтвам у міжпарламенцкіх структурах*

Для дзеячаў законатворчасці важна не толькі «варыцца» ў праблемах уласнай дзяржавы, але і сачыць за знешнім колам — выбудоўваць адносіны з замежнымі калегамі, знаёміцца з іх напрацоўкамі ды і сваімі дзяліцца. Місіяй пастаянна дзеючых дэлегацый, якія былі сфарміраваныя ўчора на сесіі Палаты прадстаўнікоў, стане ўмацаванне сувязяў з парламентамі іншых дзяржаў і міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі.

— Беларусь мае членства ў сямі міжнародных парламенцкіх структурах, — канстатаваў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргей Маскевіч, выступаючы ў Авальнай зале, — Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкая Асамблея ЕўрАзЭС, Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц СНД, Парламенцкая Асамблея Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Парламенцкая Асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, Парламенцкая Асамблея Праваслаўя і Парламенцкая Асамблея Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Апроч таго, наша краіна кантактуе ў той ці іншай ступені з ПА Савета Еўропы, ПА Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, ПА НАТА, Паўночным Саветам.

**РАСІЙСКІ ВЕКТАР**

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД падкрэсліў асаблівую значнасць расійскага вектара айчыннай знешняй палітыкі. Таму такое важнае і супрацоўніцтва на парламенцкім узроўні. На беларускую дэлегацыю ў Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі, як лічыць Сяргей Маскевіч, «ускладаецца вельмі сур'ёзная задача па развіцці прававой асновы Саюзнай дзяржавы, адстойванні інтарэсаў Рэспублікі Беларусь».

Нагадаем, што фарміраванне складу ўдзельнікаў Парламенцкага Сходу адбываецца на парытэтнай аснове — па 36 прадстаўнікоў абедзвюх краін. Сваю квоту Беларусь размяркуе такім чынам: 23 дэпутаты і 13 сенатараў. У структуры Парламенцкага Сходу — восем камісій, у кожную з якіх нацыянальныя парламенты дэлегуюць сваіх прадстаўнікоў.

**У ВУЗКІМ АСЯРОДКУ**

У рамках МПА СНД і МПА ЕўрАзЭС прынята больш як 150 мадэльных заканадаўчых актаў, палажэнні многіх з якіх узятыя за аснову пры падрыхтоўцы адпаведных дакументаў у Беларусі. Актыўны ўдзел нашай краіны ў рабоце гэтых структур, на думку Сяргея Маскевіча, спрыяе не толькі ўдасканаленню нацыянальнага заканадаўства, але і развіццю эканамічнага супрацоўніцтва, умацаванню палітычнага і міжнароднага аўтарытэту Беларусі.

МПА СНД інтэгруе напрацоўкі парламентарыяў 10 краін-удзельніц, адпаведная і колькасць пастаянных камісій у складзе арганізацыі, кожную з якіх узначальвае прадстаўнік адной з дзяржаў Садружнасці. Беларусь традыцыйна дэлегуе ва ўсе камісіі па два дэпутаты і па аднаму сенатару.

**НА ГЛАБАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ**

Міжпарламенцкі саюз — адна з найстарэйшых арганізацый такога кшталту ў свеце. Яна мае амаль 120-гадовы вопыт, трывала супрацоўнічае з ААН і яднае парламентарыяў з больш як 150 краін свету.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

# ТРУБА ПРАНІЗАЛА МАРШРУТКУ

**Нечуваная для Гродна аварыя адбылася вечарам 12 лістапада. На вуліцы Будзёнага сутыкнуліся «Форд-Транзіт» і «Рэно-Кліа».**

Маршрутнае таксі з пасажырамі рухалася з боку чыгуначнага вакзала, легкавы аўтамабіль справа ад яго ўязджаў на перакрыжаванне. Удар атрымаўся датычным, аднак пасля сутыкнення мікрааўтобус змяніў траекторыю і левымі коламі заскочыў на тратуар. Там «Форд» урэзаўся ў бар'ерную агароджу. Не вытрымаўшы націску, металічная канструкцыя зламалася. Частка трубы агароджы ўваткнулася ў мікрааўтобус і дайшла практычна да паловы салона. Пры гэтым малады пасажыр, які сядзеў справа ад вадзіцеля маршруткі, атрымаў найцяжэйшую траўму нагі, і быў шпіталізаваны. (У выніку траўмы частку нагі прыйшлося ампутаваць.) Хто праехаў на забаронны сігнал святлафора, высвятляецца, аднак відавочна, што кімсьці з вадзіцеляў былі парушаны правілы праезду рэгулюемага перакрыжавання. Цікава, што літаральна напярэдадні (11 лістапада) вадзіцель мікрааўтобуса здзейсніў ДТЗ на вуліцы Горкага: сутыкнуўся з «Фольксваген-Гольфам». Тады пашкоджанні атрымалі толькі транспартныя сродкі.

**Алег ДУК,**
**старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЕНШ ЗА ЎСІХ СВАІМ УРАДАМ ЗАДАВОЛЕНЫЯ ЎКРАІНЦЫ, АРГЕНЦІНЦЫ І РАСІЯНЕ

**Падчас апытання, якое праводзілася ў 21 краіне свету пад эгідай амерыканскай арганізацыі Program on International Policy Attitudes, рэспандэнтам прапаноўвалася ацаніць урад па трох параметрах: як урад клапоціцца аб харчаванні сваіх грамадзян, ці спрыяе даступнасці адукацыі і ці гарантуе якаснае медыцынскае абслугоўванне.**

Як высветлілася, больш за ўсё задаволеныя сацыяльным абслугоўваннем у Кітаі, Вялікабрытаніі, Ірландыі і на тэрыторыі Палесцінскай аўтаноміі. Рэкардсменамі па незадаволенасці аказаліся жыхары Аргенціны, Украіны, Расіі і Нігерыі. 80 працэнтаў аргенцінцаў і ўкраінцаў незадаволеныя тым, як урад забяспечвае харчаванне, крыху больш незадаволеныя адукацыяй, а аховай здароўя не задаволіліся 82 працэнты аргенцінцаў і 93 працэнты ўкраінцаў. Сярод жыхароў развітых краін вышэй за ўсё ацэньваюць сацыяльную палітыку сваёй дзяржавы брытанцы. Амерыканцам не падабаецца сітуацыя ў ахове здароўя. Немцы, наадварот, незадаволеныя адукацыяй, а французам здаецца недастатковым клопат урада аб доступе да харчавання.

### КІРАЎНІК ПЕНТАГОНА НАЗВАЎ РАЗМЯШЧЭННЕ РАКЕТ У КАЛІНІНГРАДЗЕ ПРАВАКАЦЫЯЙ

**Міністр абароны ЗША Роберт Гейтс у чацвер асудзіў расійскія планы па размяшчэнні ракет у Калінінградскай вобласці.**

Выступаючы пасля сустрэчы прадстаўнікоў НАТА і Украіны ў Талінне, Гейтс назваў заяву на гэтую тэму, зробленую прэзідэнтам РФ Дзмітрыем Мядзведзевым, «правакацыйнай» і «неабгрунтаванай».

### КАРЫМАЎ РАСТЛУМАЧЫЎ ПРЫЧЫНУ ВЫХАДУ З ЕЎРАЗЭС

**Прэзідэнт Узбекістана Ісламам Карымаў у лісце Інтэграцыйнаму камітэту ЕўрАзЭС растлумачыў прычыны, па якіх краіна вырашыла прыпыніць членства ў гэтай арганізацыі.**

Паводле слоў Карымава, дзейнасць Еўразійскай эканамічнай супольнасці шмат у чым дублюе працу іншых міжнародных арганізацый, членам якіх з'яўляецца Узбекістан (СНД і АДКБ). Акрамя таго, ён заявіў аб сур'ёзных рознагалоссях з ЕўрАзЭС па пытанні аб далучэнні яго членаў да Мытнага саюза. Нагадаем, што аб выхадзе Узбекістана з ЕўрАзЭС раней паведамілі крыніцы ў расійскім МЗС.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.11.2008 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 134,00 |
| 1 еўра | 2 668,99 |
| 1 латвійскі лат | 3 763,00 |
| 1 літоўскі літ | 773,09 |
| 1 чэшская крона | 105,17 |
| 1 польскі злоты | 710,27 |
| 1 расійскі рубель | 77,12 |
| 1 украінская грыўня | 368,25 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 27,4704 |
| 10 UAH | 34,6319 |
| 1000 BYR | 12,9976 |
| EUR | 47,4856 |

# ДЗЕНЬ ПРЫМІРЭННЯ

**Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная Дню прымірэння, ці 90-годдзю заканчэння Першай сусветнай вайны, прайшла ў вялікай зале Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Навукоўцы, прадстаўнікі Узброеных Сілаў, пісьменнікі, краязнаўцы, энтузіясты і госці з іншых краінаў цэлы дзень вялі гутаркі пра падзеі больш як 90-гадовай даўніны — пачынаючы ад лёсаў уласных продкаў і да геапалітычных наступстваў той вайны.**

Госці з Расіі ў сваіх выступленнях адзначалі, што ў Беларусі вельмі шмат робіцца ў памяць Першай сусветнай вайны ў параўнанні з Расіяй. Магчыма, такое ўражанне ў іх склалася пасля адкрыцця напярэдадні канферэнцыі памятнага каменя ахвярам той вайны ў Баранавіцкім раёне. Бо беларускія навукоўцы і краязнаўцы, у адрозненне ад калег, шапказакідальніцтвам не займаліся і расказвалі пра сітуацыю са стаўленнем да Першай сусветнай вайны ў Беларусі так, як ёсць насамрэч.

Напрыклад, на малую колькасць навуковых даследаванняў беларускіх гісторыкаў той вайны паскардзіўся **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі:**

— На жаль, у беларускай гістарычнай навуцы Першая сусветная вайна слаба распрацаваная, і гэта нягледзячы на тое, што па нашай зямлі праходзіла лінія фронту і вяліся вельмі важныя баявыя дзеянні. Часткова такую няўвагу гісторыкаў можна растлумачыць тым, што даследаванне гэтай праблемы было аддадзена Інстытуту ваеннай гісторыі Міністэрства абароны СССР, але ж і пасля распаду Савецкага Саюза сітуацыя не змянілася. Асобныя гісторыкі нават у 90-я гады сталі сцвярджаць, што паколькі старая армія была расійская, то і вывучаць гэтую праблему павінны расіяне. Але нельга забывацца на тое, што ў расійскую армію было мабілізавана да 50 працэнтаў працаздольнага мужчынскага насельніцтва Беларусі — гэта каля 900 тысяч чалавек... Я мяркую, што сёння Інстытуту гісторыі трэба выпраўляць становішча, бо, для параўнання, на тэму Другой сусветнай вайны ў нас выдадзена больш за 10 тысяч публікацый, сярод якіх і шматтомныя зборнікі дакументаў, а вось на тэму Першай сусветнай вайны няма ніводнага грунтоўнага выдання.

Былі выказаны турботы і наконт пахаванняў салдатаў Першай сусветнай. Слушна сказаў **палкоўнік Анатоль ШАРКОЎ, доктар гістарычных навук, прафесар Акадэміі МУС Беларусі:**

— Людзі абаранялі сваю радзіму. Не трэба казаць, што абаранялі цара і што вайна была Мікалаеўскай. Бо тады трэба будзе казаць, што Вялікая Айчынная — сталінская вайна, бо ваявалі за Сталіна, а гэта не так. Палітыкі, ідэолагі прыходзяць і знікаюць, а тое, што людзі абаранялі сваю Айчыну — застаецца. І месцы пахаванняў, належны апошні прыстанак воінаў, будуць сведчыць аб тым, што пра іх помняць...

Сказаць, што нічога не робіцца ў нас для захавання могілак Першай сусветнай, нельга, бо вядзе працу ўпраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў вайны Міністэрства абароны Беларусі, за некаторымі пахаваннямі назіраюць мясцовыя жыхары і мясцовыя органы ўлады. Аднак нават **палкоўнік Віктар ШУМСКІ, начальнік вышэй узгаданага ўпраўлення па ўвекавечанні памяці,** адзначыў, што ўлічаны далёка не ўсе пахаванні тых часоў і агучыў прапанову да ўвагі мясцовых органаў:

— Міністэрства абароны лічыць першачарговай задачу для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў актывізаваць выяўленне ўсіх месцаў вайсковых пахаванняў таго перыяду, дзе захаваліся надмагільныя збудаванні, бо, улічваючы 90-гадовы тэрмін, шанцаў прачытаць імёны загінулых усё меней і меней... Так што дакладная фіксацыя зместу надпісаў — першачарговай важнасці.

Акрамя непасрэдна пахаванняў, важнымі сведкамі той вайны спецыялісты лічаць і фартыфікацыйныя збудаванні, якія захаваліся.

Абараняльныя аб'екты з'яўляюцца гістарычнай і культурнай каштоўнасцю, — адзначыў у сваім выступленні **Аляксандр БАЗАРНАЎ, навуковы кіраўнік комплексу «Лінія Сталіна».** — Але не маючы афіцыйнага статусу помнікаў фартыфікацыі, шмат якія з іх ужо страчаны, а астатнія могуць быць згублены ў любы час. Сёння неабходна захаваць тое, што яшчэ можна выратаваць. А для гэтага трэба аб'яднаць намаганні і гісторыкаў, і грамадскасці, і дзяржаўных органаў...

Гэту міжнародную навуковую канферэнцыю можна лічыць важным крокам наперад у пераасэнсаванні ролі Першай сусветнай вайны ў гісторыі Беларусі. Але наперадзе яшчэ такіх крокаў будзе шмат, бо тыя ж жыхары Заходняй Еўропы нас значна апярэдзілі ў гэтым сэнсе. Напрыклад, шанаванне ахвяраў Першай сусветнай вайны там праходзіла на самым высокім узроўні: на мяжы Францыі і Германіі ў сумнавядомым Вердэне вянкі да пахаванняў салдатаў той вайны ўсклалі прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі, наследнік брытанскага трона прынц Чарльз, генерал-губернатар Аўстраліі Квенцін Брус, прэзідэнт верхняй палаты парламента Германіі Піцер Мюлер. Радуе, што і ў нас, як кажуць, лёд крануўся...

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ АХОВЕ ЗДАРОЎЯ ІСТОТНА ПАЛЯПШАЕЦЦА

**Такую ацэнку даў міністр аховы здароўя Беларусі Васіль Жарко на сумесным пасяджэнні ў Маскве калегіі Міністэрства аховы здароўя Беларусі і Міністэрства аховы здароўя і сацыяльнага развіцця Расіі.**

У пацвярджэнне Васіля Жарко прывёў наступныя факты: за 9 месяцаў гэтага года рост колькасці народжаных у Беларусі склаў 4 працэнты. Пры гэтым паказчык дзіцячай смяротнасці не перавысіў 4,5 праміле, што адпавядае еўрапейскаму ўзроўню, а паказчык мацярынскай смяротнасці знізіўся да 2,5 на 1 тыс. народжаных. Паводле слоў міністра, у краіне фіксуецца зніжэнне смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, хваробаў страўнікава-кішачнага тракту, іншых прычын. Дасягнута змяншэнне захваральнасці на туберкулёз на 13 працэнтаў. Чакаецца ў Беларусі і рост сярэдняй працягласці жыцця. Паводле прагнозу, у 2008 годзе яна складзе 70,2 года, прытым што яшчэ ў 2002 годзе гэты паказчык дасягаў толькі 68 гадоў. У мужчын сярэдняя працягласць жыцця за гэты перыяд узрасце з 62 да 64 гадоў, у жанчын — з 74 да 76,2 года. Прыведзеныя лічбы ўразілі міністра аховы здароўя і сацыяльнага развіцця Расіі Таццяну Голікаву. «Думаю, што многія расійскія калегі прыемна здзіўлены, — сказала яна. — Уцешна, што нашы бліжэйшыя суседзі змаглі дасягнуць такіх паказчыкаў».

**БЕЛТА.**

# ЗНЕШНЯЕ КОЛА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Удзел Беларусі ў МПС, паводле меркавання Сяргея Маскевіча, дае магчымасць узаемадзейнічаць з парламентарыямі многіх краін, рабіць свой унёсак у рашэнне такіх глабальных праблем сучаснасці, як экалагічная бяспека, барацьба з тэрарызмам і экстрэмізмам, выкананне правоў чалавека, процідзеянне новым выклікам і пагрозам. Членства ў МПС — калектыўнае, у яго ўваходзяць нацыянальныя групы, якія могуць уключаць увесь склад парламента. Айчынныя парламентарыі прынялі менавіта гэтую схему. Мы пісалі ўжо, што на першай сесіі Савета Рэспублікі было вырашана ўключыць у Нацыянальную групу ўвесь склад сенатараў, аналагічнае рашэнне прынята ўчора на сесіі і ніжняй палатай парламента.

— Уяўляецца мэтазгодным, каб Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь у поўным складзе ўвайшоў у нацыянальную групу Беларусі ў Міжпарламенцкім Саюзе, — рэзюмаваў Сяргей Маскевіч.

### МІЖНАРОДНАЯ БЯСПЕКА

— Беларусь праводзіць прынцыповую і паслядоўную знешнепалітычную лінію па пытаннях раззбраення і кантролю над узбраеннем, добрасумленна выконвае ўзятыя на сябе ў гэтай сферы міжнародныя абавязацельствы, а таксама падтрымлівае намаганні сусветнай супольнасці па пераадоленні распаўсюджвання зброі масавага паражэння, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Мы разглядаем умацаванне патэнцыялу Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў якасці важнага фактару забеспячэння нацыянальных інтарэсаў нашай краіны.

Працягваючы тэму міжнароднай бяспекі, палітык выказаў меркаванне аб тым, што «ў агляднай будучыні НАТА застанецца адным з дамінуючых фактараў сістэмы бяспекі на Еўраатлантычнай прасторы. Непасрэднае суседства Беларусі з Альянсам і значная працягласць агульных межаў узмацняюць неабходнасць выбудоўвання канструктыўных адносінаў з гэтым ваенна-палітычным блокам. Нягледзячы на захаванне палітычных праблем у адносінах з НАТА, лінія беларускага боку на актыўнае практычнае супрацоўніцтва з НАТА застаецца нязменнай, мае сістэмны і доўгатэрміновы характар».

З улікам гэтага было прапанавана сфарміраваць дэлегацыю Нацыянальнага сходу Беларусі ў ПА АДКБ і дэлегацыю па ажыццяўленні кантактаў з ПА НАТА.

### РАЗМАРОЗКА ПА-ЁЎРАПЕЙСКУ

— У Палаце прадстаўнікоў другога і трэцяга скліканняў дастаткова дынамічна і вынікова вялося ўзаемадзеянне з Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ. Было адноўлена паўнапраўнае членства нашай краіны ў гэтай арганізацыі, — нагадаў Сяргей Маскевіч. — У трывалай кардынацыі з Міністэрствам замежных спраў Беларусі праводзіўся курс на прагматычнае супрацоўніцтва з ПА АБСЕ, нацэленае на атрыманне перш за ўсё практычных выгод з нашага членства ў гэтай арганізацыі. Гэта дазволіла пераключыць супрацоўніцтва з АБСЕ з вострых палітызаваных тэмаў на канкрэтныя карысныя праекты.

Палітык заявіў таксама, што задача паступовага «размарожвання» адносінаў з ПАСЕ працягвае заставацца актуальнай на найбліжэйшую перспектыву. Ён нагадаў, што Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы з'яўляецца дарадчым прадстаўнічым органам тых краін, што ўваходзяць у склад Савета Еўропы. Беларусь жа членам гэтай арганізацыі не з'яўляецца. Раней айчынны парламент меў статус спецыяльна запрошанага, аднак ён быў прыпынены. «Палата прадстаўнікоў трэцяга скліканння рабіла актыўныя крокі па аднаўленні свайго статусу, меліся актыўныя кантакты, таму прапануецца працягнуць пачатую работу і сфарміраваць дэлегацыю Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па здзяйсненні кантактаў з ПАСЕ ў колькасці шасці дэлегатаў і шасці намеснікаў (па чатыры — ад Палаты прадстаўнікоў, па два — ад Савета Рэспублікі)».

### ЦЭНТРАЛЬНАЕЎРАПЕЙСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ВА ЎЗНАЎЛЯЛЬНАЙ ЭНЕРГІІ

Анатоль Паўловіч, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, ТЭК, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве, у гутарцы з журналістамі адзначыў: «У нас даўняя традыцыйныя, добра ўсталяваныя адносіны з дзяржавамі, якія ўваходзяць у Цэнтральнаеўрапейскую ініцыятыву, асабліва ў парламенцкім складніку. Папярэднія чатыры гады былі насычаныя абсалютна канкрэтнымі дзеяннямі, у тым ліку ў 2007 годзе мы прымалі парламенцкую дэлегацыю з краін Еўропы, якія ўваходзяць у Цэнтральнаеўрапейскую ініцыятыву, і праводзілі стварэнне агульнага камітэта на базе парламента нашай краіны. Гэта былі вельмі прадуктыўныя адносіны, мы пачалі падрабязна абмяркоўваць сітуацыю па развіцці малога і сярэдняга бізнэсу, прыступілі да разгляду многіх пытанняў, звязаных з узнаўляльнай энергетыкай — тое, чым багатая Еўропа. І ў плане развіцця гэтых працэсаў у нашай краіне, безумоўна, гэта тэма вельмі актуальная».

Імпульс для міжпарламенцкага супрацоўніцтва дадзены, застаецца толькі чакаць ад народных абраннікаў слушных і запатрабаваных ініцыятыў.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# РАБОТА ПЛЮС «ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ»

Прамая лінія

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць загадчык юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Іванавіч ШЭЛКОВІЧ і намеснік загадчыка юркансультацыі ФПБ Васіль Мікалаевіч КОРСУК.**

**(Працяг. Пачатак у нумарах за 12, 13 лістапада.)**

☎ ***— Зараз наша сям'я не лічыцца маладой, але мае двух няпоўнагадовых дзяцей, у тым ліку дзіця-інваліда, мы з жонкай знаходзімся ў першым шлюбе. Цяпер наша сям'я пражывае і прапісана ў вёсцы на Магілёўшчыне, аднак сітуацыя складваецца так, што неўзабаве мы павінны будзем пераехаць у Маладзечна. Адсюль першае пытанне: ці можна паранейшаму мець прапіску на Магілёўшчыне, але стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў у Маладзечне? Інакш кажучы, ці можна стаць у чаргу не па месцы прапіскі?***

***Другое пытанне. Ці можам мы, як сям'я з няпоўнагадовым інвалідам, разлічваць на пазачарговае атрыманне льготнага крэдыту на будаўніцтва вы можаце.***

***Трэцяе. Чулі, што грамадзяне, якія пастаянна пражываюць і працуюць у бюджэтнай сферы ў сельскай мясцовасці, могуць адначасова скарыстацца і льготным крэдытам, і аднаразовай бязвыплатнай субсідыяй. Ці так гэта? І ці будзе датычыцца гэта норма нас — зноў-такі ў выпадку пераезду ў Маладзечна з захаваннем прапіскі на Магілёўшчыне?***

***Чацвёртае. Мы з жонкай працуем па кантрактах выкладчыкамі. Наша выкладчыцкая нагрузка вызначана ў 720 гадзін у год. І ў мяне, і ў жонкі такіх гадзін атрымалася менш. Таму нас «дагрузілі» да стаўкі гадзінамі кіраўнікоў гурткоў. Аднак гадзіна кіраўніка гуртка аплачваецца ніжэй, чым выкладчыцкай. У сувязі з гэтым, ці можам мы патрабаваць, каб стаўка складалася толькі з выкладчыцкіх гадзін?***

***Пятае. Ці мае наймальнік права не працягнуць кантракт пасля заканчэння тэрміну яго дзеяння з маці і дзіцяці-інваліда?***

***І шостае. Не так даўно нам сказалі, што, паводле пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і галіновым прафсаюзам, перавесці на кантракт маці дзіця-інваліда можна толькі з яе згоды. Жонка гэтага не ведала і кантракт падпісала. Ці можа жонка патрабаваць, каб пасля заканчэння цяперашняга кантракта яе перавялі на бестэрміновы працоўны дагавор?***

**Віктар СЯМЁНАЎ,**
*Горацкі раён*

— Стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў у райвыканкаме вы не зможаце — для гэтага трэба мець рэгістрацыю ў Маладзечне. Разам з тым магчымасць стаць у чаргу па месцы працы будзе.

Другое. Як сям'я з няпоўнагадовым дзіцем-інвалідам, разлічваць на пазачарговае атрыманне льготнага крэдыту на будаўніцтва вы можаце.

Трэцяе. Права на сумеснае выкарыстанне і льготнага крэдыту, і бязвыплатнай субсідыі ў вас будзе. Але толькі ў выпадку, калі падыдзе чарга на субсідыю.

Чацвёртае. Калі ў кантракце не ўказана, што вы працуеце ў няпоўным рэжыме, вас павінны загрузіць на поўную стаўку. Прычым права дамагацца таго, каб загрузілі менавіта выкладчыцкімі гадзінамі, безумоўна, ёсць. Аднак сітуацыя не такая адназначная. Колькасць дзяцей, асабліва ў сельскай мясцовасці, змяншаецца, і можа атрымацца так, што патрэбнай колькасці выкладчыцкіх гадзін на ўсіх не хопіць. Таму Міністэрства адукацыі сапраўды дазволіла «дагружаць» да стаўкі тымі ж гурткамі, факультатывамі, ці, пры неабходнай адукацыі, выкладаннем іншых дысцыплін — скажам, фізкультурай ці працоўным навучаннем. І да гэтага трэба ставіцца з разуменнем.

Пятае. Дадатковых гарантый па працягу кантракта з бацькамі няпоўнагадовага дзіцяці-інваліда ў нашым заканадаўстве няма. Такія гарантыі прадугледжаны, да прыкладу, для маці, бацькі або апекуна, якія выхоўваюць дзіця ва ўзросце да 5 гадоў. Разам з тым неабходнасць працягу кантракта з бацькамі дзіцяці-інваліда можа быць вызначана на ўзроўні канкрэтнай арганізацыі — скажам, у калектыўным дагаворы. Прычым, калі такі запіс у калдагаворы ёсць, наймальнік абавязаны яго выконваць.

І шостае. Зараз перайсці з кантракта на бестэрміновы працоўны дагавор вашай жонцы ўжо складана. Разам з тым у выпадку пераезду на новае месца жыхарства і ўладкавання там на работу, права патрабаваць заключэння бестэрміновага працоўнага дагавора ў жонкі будзе.

☎ ***— Наколькі вядома, сёлета трэба дагуляць водпускі за мінулыя гады. Аднак ці можна перанесці на 2009 год частку ўжо сёлетняга водпуску?***

**Антаніна Раманаўна,** *г. Мінск*
(падобнае пытанне — з Салігорскага раёна)

— Працоўны кодэкс вызначае, што ў выпадку, калі выкарыстанне водпуску неспрыяльна адаб'ецца на вытворчасці, наймальнік, з абавязковай згоды работніка, можа перанесці частку водпуску на наступны год. І ў тым ліку такі перанос магчымы на год 2009.

Разам з тым трэба падкрэсліць: гаворка ідзе менавіта аб перанесе частковым. Як мінімум 14 каляндарных дзён водпуску неабходна адгуляць менавіта сёлета. Пры гэтым астатнюю, перанесеную частку водпуску па жаданні работніка можна або далучыць да водпуску ў наступным годзе, або выкарыстаць асобна.

І яшчэ. Трэба мець на ўвазе, што заканадаўства не дапускае перанос на наступны год часткі водпуску работніка ва ўзросце менш за 18 гадоў, а таксама водпускаў, якія даюцца за работу ў шкодных ці небяспечных умовах.

☎ ***— Якая працягласць працоўнага дня ў туберкулёзнай групе ясляў-садка для выхавальніка і памочніка выхавальніка? І ці павінна быць даплата выхавальнікам і памочнікам выхавальніка за туберкулёзную групу — апроч даплаты за санаторны садок і дадатковага водпуску?***

**Валянціна Іванаўна,**
*г. Смаргонь*

— Адказаць на першае пытанне пакуль цяжка. Скарочаная працягласць працоўнага часу, дадатковы водпуск і кампенсацыі за шкоднасць будуць залежаць ад вынікаў атэстацыі працоўнага месца, якую трэба правесці да 1 студзеня. Адно, што да правядзення атэстацыі правілы застаюцца ранейшымі. Што ж да дадатковай даплаты, то яна будзе адна — наколькі мы разумеем, вы атрымліваеце яе за работу ў санаторным яслях-садку.

☎ ***— Сыну — інваліду II групы прапануюць прайсці курсы для атрымання пасведчання на аўтамабіль з ручным кіраваннем. Такія курсы знаходзяцца ў іншым раёне і працягваюцца 3 месяцы. Ці маюць права прадаставіць сыну такі працяглы водпуск за свой кошт, калі наймальнік на гэта згодны?***

**Ніна ДАРАГУЖ,**
*Дзяржынскі раён*

— Калі сын працуе ў спецыялізаванай арганізацыі інвалідаў, ён можа ўзяць водпуск за свой кошт працягласцю да 14 каляндарных дзён. Плюс да таго, паводле новага варыянту Працоўнага кодэкса, па дамоўленасці з наймальнікам работнік можа ўзяць водпуск без захавання зарплаты на сямейна-бытавыя патрэбы працягласцю да 30 каляндарных дзён у год — калі большая працягласць не вызначана ў калектыўным дагаворы. Таму гэту праблему магчыма вырашыць менавіта праз калдагавор.

☎ ***— Патлумачце, калі ласка, ці ўваходзіць у працоўны час вадзіцеля час пагрузкі і разгрузкі аўтамабіля?***

**Сяргей Петрушэнка,**
*г. Гомель*

— Паколькі пры разгрузцы вы знаходзіцеся ў аўтамабілі, інакш кажучы, на сваім працоўным месцы, то гэты час з'яўляецца працоўным.

☎ ***— Працую на палову стаўкі, па 4 гадзіны ў дзень. Пры гэтым часта мяне просяць затрымацца звыш гэтага часу. Як павінна гэта аплачвацца і ці магу я патрабаваць пераводу, скажам, на 0,75 стаўкі?***

***І другое пытанне. На якіх умовах я, як паўставачнік, магу ўладкавацца па сумяшчальніцтве ў іншым месцы — на 0,5 або на поўную стаўку? І ці магу я не прыносіць на «сумяшчальніцкае» месца сваю працоўную кніжку?***

**Аляксандр,** *г. Мінск*

— Паколькі вы працуеце ў рэжыме няпоўнага працоўнага дня, даплаты за звышурочныя немагчымыя. Аднак вы, як работнік на 0,5 стаўкі, можаце проста адмовіцца ад работы працягласцю больш за 4 гадзіны ў дзень. Або сапраўды паставіць пытанне аб пераводзе на 0,75 стаўкі.

Што ж да другога пытання, то ўладкавацца па сумяшчальніцтве можна толькі на 0,5 стаўкі. Разам з тым, ніхто не забараняе «ўзяць» па палове стаўкі па сумяшчальніцтве ў двух месцах. Дарэчы, прадастаўляць працоўную кніжку пры ўладкаванні па сумяшчальніцтве не патрабуецца.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Абзац

■ Нацыянальная кампанія «Белавія» з 13 лістапада па 22 снежня прадае білеты на калінінградскі накірунак па зніжаных тарыфах. Рэйсы Мінск — Калінінград — Мінск выконваюцца штодзень. Кошт аднаго білета ў гэты час складае на рэйс Мінск — Калінінград 65 еўра без уліку аэрапортавых таксаў і збораў, на рэйс Калінінград — Мінск — 60 еўра, таксама без збораў.

■ **У Мінску ў выніку няшчаснага выпадку загінуў 30-гадовы індывідуальны прадпрымальнік. Пры правядзенні рамонтных работ ён выпаў з акна сваёй кватэры, размешчанай на 14-м паверсе дома па вуліцы Цімірязева. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў ён памёр на месцы. Праверку праводзіць пракуратура.**

■ Больш за 300 чалавек давялося эвакуяваць выратавальнікам з будынка школы № 70 па вуліцы Калініоўскага ў Мінску. Прычынай паслужыла распыленне невядомым у памяшканні навучальнай установы перцавага газу з аэразольнага балончыка. Праводзілася эвакуацыя 311 вучняў, 23 настаўнікаў і 5 тэхработнікаў. Заняткі ў школе былі спыненыя, вучэбны дзень перанесены на 15 лістапада. Пацярпелых няма. Праводзіцца праверка.

■ **У Гаіці абрушылася другая за тыдзень школа. 7 лістапада пры першым абрушэнні ў прыгарадзе сталіцы Порт-о-Прэнс загінулі 93 чалавекі. На гэты раз надзвычайнае здарэнне адбылося ў самой сталіцы. Дакладны лік пацярпелых пакуль невядомы. Інцыдэнт адбыўся пасля моцных ліўняў.**

■ Міністэрства ўнутраных спраў Брытаніі апублікавала новы спіс самых запатрабаваных прафесій, уладальнікі якіх маюць найбольш рэальныя шанцы імігрыраваць у Аб'яднанае Каралеўства. Сярод дэфіцытных прафесій — самыя рэдкія і нечаканыя. Згодна з новай імігрыцыйнай палітыкай Брытаніі, найбольш запатрабаванымі асобамі з'яўляюцца сёння балетныя танцоры, спецыялісты па стрыжцы авечак, рэзчыкі замарожанай рыбы, футбалісты і трэнеры коней. У спіс трапілі і больш тыповыя прафесіі: настаўнікі матэматыкі, біялогіі, хіміі, фізікі і геалогіі. Новая сістэма набору балаў, згодна з якой тыя, чыя прафесія будзе больш патрэбнай, атрымліваюць большую колькасць ачкоў пры праходжанні тэсціравання, накіравана на барацьбу з вялізным патокам у Брытанію некваліфікаваных імігрантаў з краін, што не ўваходзяць у Еўрасаюз. Новыя правілы ўступаюць у сілу з 27 лістапада.

■ **У Сараташе шпіталізаваныя 24 чалавекі з ліку абслуговага персаналу турыстычнага цягніка, які ажыццяўляў ваяж па Сярэдняй Азіі. Цягнік быў сфарміраваны ў Маскве, у кастрычніку выехаў у Алма-Ату, дзе ў яго селі іншаземцы, жыхары Германіі. Ён праехаў Самарканд, Бухару, Ташкент і іншыя гарады Сярэдняй Азіі, пасля чаго вярнуўся ў Алма-Ату. Там жа адна з пасажырак, грамадзянка Германіі, звярнулася ў клініку па дапамогу, ёй быў пастаўлены дыягназ «халера». З улікам каротката інкубацыйнага перыяду гэтага захворвання было ўстаноўлена, што заражэнне адбылося падчас падарожжа. Усе, хто мог кантактаваць з пасажыркай, былі шпіталізаваныя для абследавання ў стацыянары Саратава.**

## Поўны абзац

■ Паліцэйскі з румынскага горада Брасаў стрэліў у калегу пры спробе супакоіць групу п'яных падлеткаў. Ахоўнікаў правапарадку выклікалі жыхары горада, што жывуць непадалёк ад цэнтральнай плошчы. Гараджанам не спадабалася, што група падлеткаў п'е спіртное і гучна мацюкаецца. Паліцэйскія, якія прыбылі на месца, зразумелі, што на ўгаворы моладзь не адрэагуе, і аднаму з іх прыйшла ў галаву ідэя зрабіць папераджальны стрэл у паветра. Аднак вартавы парадку занадта рана зняў пісталет з засцерагальніка, у выніку стрэл адбыўся раней, чым было патрэбна. Куля трапіла ў нагу яго напарніка. Стрэл усё ж выканаў сваю ролю: падлеткі спужаліся і збеглі. Сам сталкі трапіў пад следства.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# МОРГ. І ТАМ БЯРУЦЬ

Ну і ну!

**Судом Полацкага раёна разгледжана незвычайная крымінальная справа — судзілі работнікаў морга за... прыняцце незаконнага ўзнагароджання.**

Як паведаміла старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына Таўтын, два санітары Полацкага міжраённага патолагаанатамічнага аддзялення Віцебскага абласнога клінічнага патолагаанатамічнага бюро падазраваліся ў тым, што бралі грошы са сваякоў нябожчыкаў за мыццё трупаў. А павінны былі гэта рабіць бясплатна, бо такая праца ўваходзіла ў іх службовыя абавязкі.

Атрымаўшы згоду сваякоў на перадачу грошай, прадпрымальныя санітары складвалі заявы і дамовы на аказанне рытуальных паслуг і атрымлівалі ад сваякоў нябожчыка наяўныя грошы, сума якіх у некалькі разоў перавышала максімальна магчымы кошт рытуальных паслуг. Частку грошай, атрыманых ад сваякоў нябожчыка, аплачвалі ад імя заказчыкаў на рахунак абласнога патолагаанатамічнага бюро, а астатнія дзялілі — кожнаму палову.

Усяго абвінавачаным інкрымінавалася ўчыненне 17 такіх эпізодаў. Пракурорскія супрацоўнікі падлічылі, што гэтыя дзялкі ў моргу незаконна зарабілі на мыцці трупаў каля 1 мільёна 780 тысяч рублёў. За адну паслугу бралі ў сярэднім па 100 тысяч беларускіх рублёў. На судзе яны поўнасцю прызналі сваю віну. Гэта і іншыя змякчальныя абставіны па справе далі суду падставу прымяніць да двух санітараў пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на адзін год кожнаму без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**Подберезский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**Лот 1** — земельный участок в деревне Поти, площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 622085307101000023, начальная цена **1 500 000** белорусских рублей. Участок расположен на берегу реки Западная Березина, неподалеку начинается лесной массив.

**Лот 2** — земельный участок в деревне Лавский Брод, площадь участка — 0,2152 га, кадастровый номер 622085304601000019, начальная цена **1 100 000** белорусских рублей.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФРБ по Минской области РБ, р/с 3600614120172 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600059628, назначение платежа 04901, Подберезский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится **16 декабря 2008 года** в 10.00 по адресу: д. Подберезь, ул. Центральная, 1, здание сельисполкома. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **15 декабря 2008 г.** до 17.00 по адресу: д. Подберезь, ул. Центральная, 1, кабинет секретаря.

**Контактные телефоны: (8 01772) 35335, 35336.**



**Кватэрнае пытанне**

## З уліку знятых на ўлік паставяць

**З выкарыстаннем ільготнага крэдыту мы будзем будаваць сабе новае жыллё. Аднак у ім на кожнага члена сям'і будзе менш за 15 квадратных метраў агульнай плошчы. І пры гэтым нам прапануюць напісаць заяву аб знятці з кватэрнага ўліку.**

**Ці зможам пры павелічэнні сям'і зноў стаць у чаргу, скарыстацца дзяржпадтрымкай?**

**А. ЗДАНОВІЧ,** *г. Брэст.*

Правіла аб магчымасці выдзялення льготных крэдытаў пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў агульнай плошчай менш за 15 кв. метраў у аднаго чалавека было прадугледжана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 верасня 2007 г. № 414. Выдзяленне крэдытаў ажыццяўляецца пры ўмове добраахвотнага волевыяўлення грамадзян, уключаных у спісы на льготнае крэдытаванне, на знятце з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэтае новаўвядзенне дазволіла сем'ям вырашаць пытанні паляпшэння сваіх жыллёвых умоў без пераносу чарговасці на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі. Сёлета Указам ад 3 чэрвеня 2008 г. № 292 унесены адпаведныя змяненні і ў парадак зняцця грамадзян з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Прычым знятце з ўліку робіцца пасля дзяржрэгістрацыі права ўласнасці на кватэру. Гэтым жа Указам прадугледжана, што пасля зняцця з ўліку на такой падставе грамадзяне зноў могуць быць прыняты на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (а значыць, і атрымаць у парадку чарговасці льготны крэдыт), але ўжо з даты падачы заявы аб прыняцці на такі ўлік.

**Віктар САВІЦКІ.**



**ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло», 220073, г. Минск, ул. Пинская, 18**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 26 ноября 2008 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

*О проведении закрытой подписки на акции дополнительного выпуска ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».*

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 19 ноября 2008 г. в приемной Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

***Наблюдательный совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».***



**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Логойском райисполкоме**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства земельного участка гражданам Республики Беларусь для ведения коллективного садоводства, расположенного в садоводческом товариществе «Ландыш 2005», уч. 137 Логойского р-на Минской обл., кадастровый номер участка 623282000009000051, общая площадь 0,1010 га, начальная цена – 25 132 000 белорусских рублей. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за земельный участок осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **16.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*



**1 декабря 2008 г. в 8.00**

**состоится внеочередное Общее собрание акционеров ЗАО «Припутник» по адресу: г. Минск, пр. Рокоссовского, 1, конференц-зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Досрочное прекращение полномочий членов Наблюдательного совета Общества.
2. Избрание членов Наблюдательного совета.

С документами Общества, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться в приемной директора ежедневно кроме выходных и праздничных дней с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.

Форма проведения собрания: **очная**. Форма голосования по всем вопросам повестки дня **прямая, открытая.**

УНН 100071629.



**ОАО «Нерудпром» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже транспортных средств и оборудования:**

| № лота | Наименование и технические характеристики | Начальные цены с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп «ОДАЗ 9370» (1991 г.в., бортовой, 2-осный, 

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

14
ЛІСТАПАДА
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 45 (15549)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# «ТРЫМАЮЦЬ МАРКУ»

**33 дыпломы заваявалі беларускія вучні на алімпіядзе школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная супольнасць», якая праходзіла падчас восеньскіх канікулаў на базе Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У актыве нашых школьнікаў 10 дыпломаў першай, 13 — другой і 10 дыпломаў — трэцяй ступеняў. Плюс узнагароды ў намінацыях «Лепшы чытальнік» і «Лепшы знаўца».**

Алімпіяда па рускай мове і літаратуры традыцыйна ўключала ў сябе абавязковыя літаратурны і лінгвістычны туры, конкурс рытараў, а таксама творчыя конкурсы: знаўцаў, чытальнікаў і прадстаўлення камандаў. Усяго ў інтэлектуальных спаборніцтвах бралі ўдзел 24 каманды з дзвюх краін: 17 прадстаўлялі Расійскую Федэрацыю і толькі 7 — Беларусь. І ў камандным, і ў індывідуальным заліках перамога дасталася юным беларусам. Лідарамі ў камандным заліку сталі школьнікі з Мінска і Віцебскай вобласці. На другім месцы размясціліся каманды Брэсцкай і Гомельскай абласцей і на трэцім — Мінскай вобласці. У актыве расіян — толькі адно другое і адно трэцяе камандныя месцы. У індывідуальным заліку абсалютнае першае месца заняла беларуская школьніца, вучаніца 11-га класа мінскай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны Насця Куляшова. А другое месца — у вучаніцы 11-га класа Ліцэя пры Беларуска-Расійскім універсітэце (Магілёў) Надзеі Адамавай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ёсць прапанова

## ЧАМУ НЯМА ПОМНІКА МІКОЛКУ-ПАРАВОЗУ?

**Усім вядома, што з'яўленне на свет новага твора мастака або скульптара часам становіцца падзеяй грандыёзнай і знакавай, тэмай нумар адзін на старонках газет, нагодай для дыскусій. Можа нават увайсці і ў гісторыю. Так, Данія славіцца сваёй Русалачкай, пры згадванні Амерыкі ў памяці ўсплывае выява статуі Свабоды, Санкт-Пецярбург — гэта Медны Коннік, Парыж — несумненна, Эйфелева вежа. А што ж Беларусь?! Прыезджых уражваюць нашы шырокія праспекты, многія фатаграфуюцца на плошчы Перамогі каля велічнага абеліска, іншыя робяць гэта на фоне помніка Леніну... Людскія перавагі адгадаць складана, часам нават немагчыма. Але ўсё ж такі...**

Да нас у рэдакцыю прыйшоў ліст ад вучня 4-й мінскай школы Вані Моханя. І вось што ён напісаў.

*«Нядаўна мы з татам чыталі казку Андэрсена «Русалачка». Тата сказаў:*

*— А ведаеш, Ваня, у дацкім горадзе Капенгагене стаіць помнік Русалачцы, і тысячы турыстаў прыязджаюць на яго паглядзець.*

*А потым мы з татам чыталі аповесць Міхася Лынькова «Міколка-паравоз». Мне вельмі спадабаліся прыгоды Міколкі і яго дзядулі, і я запытаў у таты:*

*— Тата, а дзе стаіць помнік Міколку-паравозу?*

*— Няма такога помніка.*

*— Чаму? — здзівіўся я.*

*— Напэўна, ніхто не згадзіўся паставіць яго.*

*— А калі-небудзь паставяць?*

*— Не ведаю, — сказаў тата. — А давай запытаемся ў газеты — яна ўсё ведае!*

*Шаноўная газета!*

*Адкажыце, калі ласка, чаму няма помніка Міколку-паравозу? Калі яго пабудуюць? (Ёсць цудоўнае месца — Дзіцячы парк імя Горкага). Калі помнік не збіраюцца рабіць, то трэба сказаць гарадскім уладам, каб паклапаціліся (гэта падказаў мне тата)».*

Такая вось цікавая прапанова. Адразу ж скажам, што помніка Міколку-паравозу ні ў сталіцы, ні ў якім-небудзь іншым горадзе Беларусі, сапраўды, няма. І каб не ўзнікала пытанняў, нагадаем адзін факт. На плошчы Якуба Коласа ў лістападзе 1972 года (да 90-годдзя народнага паэта) устаноўлена кампазіцыя, створаная скульптарам Заірам Азгурам і архітэктарамі Юрыем Градавым, Леанідам Левіным і Георгіем Заборскім. У цэнтры кампазіцыі — 8-метровая статуя самога паэта, які сядзіць на валуне. Злева размясцілі галоўных персанажаў паэмы «Сымон-музыка» — скрыпача Сымона і яго сяброўку Ганку. Справа — героі аповесці «Дрыгва» — легендарны дзед Талаш і яго ўнук — юны разведчык Панас.

Мы звярнуліся ў камітэт архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама да **начальніка ўпраўлення добраўпарадкавання і гарадскога дызайну Аляксандра АНДРОНЧЫКА.** Як расказаў нам Аляксандр Іванавіч, самае галоўнае тут — гэта знайсці крыніцу фінансавання вашай задумы. Сродкаў у гарадской казне на рэалізацыю ўсіх пажаданняў не хопіць. Калі спонсар знайшоўся, эскіз вашай ідэі павінен прайсці ўзгадненне па працэдуры, прадугледжанай Саветам Міністраў. Пры станоўчым адказе — гэта значыць, што ваша скульптура арыгінальная, прыгожая, сюжэт будзе гарманіраваць з гарадскім дызайнам, можна прыступаць да працы. А ўжо мастацка-экспертны савет пры Міністэрстве культуры вырашыць, дзе паставіць ваш твор.

Таксама мы папрасілі пракаментаваць гэты ліст прызнанага мэтра гарадской скульптуры **Уладзіміра ЖБАНАВА:**

— Ідэя Вані зрабіць помнік Міколку-паравозу цікавая, будзе добра вучыцца, падрасце, можа, і сам калі-небудзь зробіць яе. Зрабіць помнік або скульптуру і паставіць на адной з вуліц горада — гэта досыць складаны працэс. Чаму няма помніка Міколку-паравозу, я неяк не задумваўся. Магчыма, гэта проста не такая важная персона?

— Якіх жа скульптур, на ваш погляд, не хапае беларускім гарадам?

— Прыгожых, арыгінальных, цікавых. Яшчэ не хапае заказчыкаў, якія маглі б рэалізаваць задумы. Ёсць людзі, якія могуць зрабіць добрую, годную працу. Аднак спонсары пакуль не аб'явіліся. Адной прапановы мала.

У наш матэрыяльны век часцей усе пытанні вырашае назапашаны капітал. А што да мастацтва і канкрэтна скульптуры, адразу ўспамінаюцца словы Жбанава: «...калі мы не будзем укладваць грошы ў прыгажосць, усюды будзе суцэльная бетонная агароджа»

**Ірына ЛЯШКЕВІЧ.**

Прафтэхшкола

# ЧАМУ ПАСПЯХОВЫЯ ВЫПУСКНІКІ НЕ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА НА ВЫТВОРЧАСЦІ?

**Два апошнія гады ў сістэмы сталічнай прафтэхадукацыі не атрымлівалася выканаць кантрольныя лічбы прыёму. І нават прыцягненне ў прафтэхустановы Мінска навучэнцаў з іншых рэгіёнаў краіны, колькасць якіх перавысіла сёлета 36 працэнтаў ад залічаных на першы год навучання, не змагло выратаваць сітуацыю: план прыёму ўсё роўна ўдалося выканаць толькі на 92,3 працэнта. Затое ў будучым годзе на выхадзе з базавай школы чакаецца рэкордная колькасць выпускнікоў: у Мінску іх будзе ў 2,8 раза больш, чым у папярэднім годзе. Такі «падарунак» сістэме прафтэхадукацыі зрабіў пераход школы на 11-гадовы тэрмін навучання. Па статыстыцы, на старшай ступені школы працягваюць навучанне толькі 60 працэнтаў вучняў. Астатнія ж ідуць вучыцца ў сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Але ці гатовы прафтэхустановы прыняць усіх ахвотных атрымаць рабочую прафесію? Наколькі сістэма прафтэхадукацыі мабільна і сінхронна рэагуе на патрэбы рынку працы? Як павысіць цікавасць моладзі да рабочых прафесій? Аб усім гэтым ішла гаворка на калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай рэалізацыі Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама Дзяржаўнай праграмы развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выдаткі на падрыхтоўку аднаго рабочага складаюць па Мінску 4,2 мільёна рублёў.

Варта нагадаць, што беларуская сталіца — асаблівы рэгіён, дзе больш хуткімі тэмпамі развіваюцца прамысловыя прадпрыемствы, дзе будуюцца грандыёзныя аб'екты накшталт Нацыянальнай бібліятэкі ці Футбольнага манежа, дзе ёсць вялікія магчымасці для працоўнай міграцыі і канкурэнцыі пры найме на работу і дзе выпускнікі школ у пераважнай сваёй большасці нацэлены на атрыманне вышэйшай адукацыі. Дастаткова сказаць, што сёлета студэнтамі ВНУ сталі 74 працэнты выпускнікоў мінскіх сярэдніх школ. Ці варта ў гэтай сітуацыі здзіўляцца недабору ў прафтэхустановы...

— Сёння можна гаварыць аб тым, што ў сталіцы пачынае паступова ўстанаўлівацца парытэт сістэмы прафтэхадукацыі і рынку працы, — паведаміў на калегіі старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Уладзімір Шчэрба. — За тры апошнія гады на падставе аналізу заявак арганізацый-заказчыкаў кадраў быў спынены прыём па 44 незапатрабаваных прафесіях і адкрыта падрыхтоўка па 63 новых для асобных навучальных устаноў кваліфікацыях. У тым ліку і зусім новых прафесіях, такіх, як мадыстка галаўных убораў ці слесар-зборшык лятальных апаратаў. Аднак трэба прызнаць, што на сёння адсутнічаюць эфектыўныя методыкі вымярэння стану і дынамікі развіцця рынку працы, а алгарытм фарміравання структуры і аб'ёму падрыхтоўкі кадраў для ўсіх галін эканомікі вызначаецца бягучай, а не прагнознай патрэбай.

А што рабіць, калі нейкае прадпрыемства істотна павялічвае аб'ёмы вытворчасці альбо адкрывае новую вытворчасць, не запланаваную раней? Адкуль браць рабочыя кадры, калі ствараецца новае прадпрыемства? Свабоднай рабочай сілы, сёння няма. Таму прагнозы трэба рабіць з пэўным запасам і з улікам патрэбаў прадпрыемстваў, якія яшчэ толькі будуюцца...

Найбольш інтэнсіўна апошнім часам змянялася структура прафесій будаўнічага профілю, а аб'ём падрыхтоўкі кадраў для будаўнічай галіны сталіцы павялічыўся з 1 тысячы чалавек у 2006 годзе да 2,8 тысячы ў 2008-м. Аднак задаволіць попыт будаўнічай галіны ў кадрах, улічваючы цяперашні будаўнічы «бум», у прафтэхустаноў усё роўна не атрымліваецца. Наменск генеральнага дырэктара «Мінскбуда» Яўген Воўна паскардзіўся, што дэфіцыт кадраў на будоўлях складае зараз каля 4 тысяч чалавек, а з улікам запланаваных на 2009 год аб'ёмаў будаўніцтва ён павялічыцца яшчэ на 2 тысячы. Самая востраdэфіцытная на прадпрыемстве прафесія — каменшчыка.

Уладзімір Шчэрба канстатаваў, што ў Мінску назіраецца ўстойлівая станоўчая дынаміка працаўладкавання выпускнікоў у адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю.

— Аднак мы добра разумеем, што станоўчая статыстыка працаўладкавання (98 працэнтаў) зусім не характарызуе станоўчую дынаміку насычэння рынку працы. Пагадзіцеся, што працэс павелічэння аб'ёмаў падрыхтоўкі і выпуску з навучальных устаноў рабочых кадраў не можа быць бясконцым, — дадаў старшыня Камітэта па адукацыі. — Неабходна, каб за напаўненне рынку працы несла адказнасць не толькі сістэма адукацыі, але і заказчыкі кадраў, замацоўваючы ў сябе маладых спецыялістаў. Тут ёсць над чым задумацца. Чаму, скажыце, даволі паспяховыя выпускнікі прафтэхустаноў не знаходзяць сябе на вытворчасці? Як сведчыць практыка, рабочыя замацоўваюцца там, дзе складваецца спрыяльны маральна-псіхалагічны клімат у калектывах, дзе больш плацяць, цэняць і паважаюць іх працу, дзе ініцыююць працяг прафесійнай адукацыі і прадастаўляюць магчымасці для яе атрымання.

Па апошніх звестках Мінскага навукова-даследчага інстытута сацыяльна-эканамічных праблем, работнікі з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй у найменшай ступені задаволеныя ўмовамі працы і заработнай платай, чым работнікі з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй. Але пры гэтым яны лічаць сябе прафесіяналамі. Вядома, што кожны тавар мае свой кошт, у тым ліку і высокакваліфікаваныя кадры, падрыхтаваныя за дзяржаўныя сродкі. Між іншым, выдаткі на падрыхтоўку аднаго рабочага з кожным годам узрастаюць і сёлета складаюць па Мінску 4,2 мільёна рублёў. Наколькі эфектыўныя такія дзяржаўныя ўкладанні?

Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў пацікавіўся меркаваннем старшыні Камітэта па адукацыі наконт мэтазгоднасці павелічэння тэрміну работы выпускнікоў прафтэхустаноў па размеркаванні. Магчыма, такім чынам удалося б хоць часткова ліквідаваць кадравыя «прарэхі»? На думку Уладзіміра Шчэрбы, проста павялічыць адпрацоўку па размеркаванні — не выйсце, таму што для таго каб утрымаць моладзь на вытворчасці, трэба прыкласці шмат намаганняў.

— Будзем вырашаць праблему праз распрацоўку і рэалізацыю мэтавай праграмы садзейнічання прафесіянальнаму станаўленню выпускнікоў прафтэхшколы і «запускаць» яе разам з заказчыкамі кадраў. У праграму ўвойдзе комплекс сістэмных мерапрыемстваў, якія спрыялі б сацыяльнай адаптацыі, кар'ернаму росту і павышэнню канкурэнтаздольнасці маладых рабочых, — дадаў кіраўнік сталічнай сістэмы адукацыі.

Кіраўнікі прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў адзначалі ў сваіх выступленнях, што навучэнцы сталі вельмі патрабавальныя да якасці навучальнага працэсу. Дарэчы, гэта пацвярджае і статыстыка: па спецыяльных дысцыплінах на працягу апошніх гадоў назіраецца станоўчая дынаміка павышэння ўзроўню вучэбных дасягненняў. У прыватнасці, павялічваецца колькасць выпускнікоў, якія атрымалі на кваліфікацыйных экзаменах адзнакі ад 8 балаў і вышэй. Па прадметах агульнаадукацыйнага цыкла ўзровень вучэбных дасягненняў навучэнцаў таксама павышаецца. І ўсё ж такі падчас цэнтралізаванага тэсціравання многія абітурыенты з кола выпускнікоў прафтэхустаноў не вытрымліваюць канкурэнцыі з іншымі. Выходзіць, што агульнаадукацыйная падрыхтоўка, з якой навучэнцы прыйшлі ў прафтэхустанову і якую яны там атрымалі, ва ўмовах цэнтралізаванага тэсціравання не дазваляе ім «прайсці» на больш высокія ступені адукацыі...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# ЭКСТРЭМАЛЫ НА ДАРОЗЕ

**У той дзень колькасць смельчакоў і экстрэмалаў на квадратны метр перавышала ўсе магчымыя нормы. Хлопцы наварочалі гразь на колы сваіх веласіпедаў, ламалі кардан і, насуперак народнай мудрасці, ішлі якраз у гару! Нядаўна ў Сілічах прайшоў Адкрыты чэмпіянат Беларусі па крос-кантры.**

Крос-кантры — гэта гонкі на веласіпедзе па перасечанай мясцовасці з цяжкімі пад'ёмамі і тэхнічнымі, хуткімі спускамі. Удзел у гэтых экстрэмальных спаборніцтвах узялі не толькі ўсе прафесійныя веласіпедныя клубы Беларусі, але і прадстаўнікі Украіны, Латвіі і Малдовы.

Дарэчы, усе ўдзельнікі і гледачы адзначалі высокі ўзровень арганізацыі чэмпіянату. Арганізатары спаборніцтваў — грамадскае аб'яднанне «Беларуская федэрацыя веласіпеднага спорту» і Міністэрства спорту і турызму — папрацавалі на славу.

На сёння ніводная з дысцыплін МТВ (ад англ. mountain «гара» і bike «веласіпед», горны веласіпед) не атрымала такога шырокага прызнання, як крос-кантры. Часткова гэта тлумачыцца даступнасцю і адносна нізкай траўматычнасцю гэтага віду спорту. Часткова — тым, што абсалютна ўсе прафесіяналы веласпорту пачыналі якраз з крос-кантры. Нават самыя экстрэмальныя даўнхілеры і фрырайдары. І, вядома ж, немалаважна і тое, што з 1996 года крос-кантрыйныя гонкі ўключаны ў праграму Алімпійскіх гульняў.

— Самае галоўнае ў крос-кантры — гэта выносліваць спартсмена. Бо без гэтага дзясяткі кіламетраў па бездарожжы не пераадолееш! Аднак і пра тэхніку таксама не варта забываць — на пад'ёмах і спусках яна нават вельмі спатрэбіцца, — тлумачыць нам Аляксандр Чупін, трэнер юнацкай зборнай Малдовы па крос-кантры, паралельна даючы парады свайму навучэнцу, што імкліва пралятае каля нас...

Як прызналіся пазней спартсмены, ад алкаголю, курэння і тлустых страў яны ўжо даўно адмовіліся: дрэнна ўздзейнічаюць на арганізм увогуле і на печань у прыватнасці. А без моцнага здароўя ні пра якія медалі і перамогі размовы быць не можа! Насамрэч, на шкодныя звычкі нават і часу не застаецца — кожны дзень трэніроўкі і гадзіны, якія патрэбна прысвяціць вывучэнню трасы, на якой будзеш выступаць.

...Тым часам быў дадзены старт для мужчын, якім трэба было пераадолець дыстанцыю ў 42 км, альбо 12 кругоў. Тут развярнулася сур'ёзная барацьба: узровень падрыхтоўкі прафесійных экстрэмалаў з кожным годам стабільна расце. А пазмагацца за медалі на чэмпіянат Беларусі прыехалі такія вядомыя веласіпедысты, як Аляксандр Кучынскі і Канстанцін Сіўцоў.

Варта адзначыць, што для правядзення такіх экстрэмальных спаборніцтваў Сілічы — месца проста выдатнае. Усе спартсмены вельмі высока ацанілі якасць трасы нашага гарналыжнага курорта.

— Зараз у Беларусі крос-кантры імкліва набірае абароты. Развіваць гэтую дысцыпліну веласпорту мы пачалі зусім нядаўна, а нашы веласіпедысты ўжо паказваюць цудоўныя вынікі, — **гаворыць выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі веласіпеднага спорту Віталь ЖМАКА.** — Таму ў нас ёсць усе падставы меркаваць, што Беларусь будзе належным чынам прадстаўлена на Алімпіядзе-2012 у Лондане!

Каб пахварэць за нашых, я спускаюся на «трасу бою». Да апошняга старту гэта самая траса ўжо — адно суцэльнае месіва. Аднак гледачоў гэта не спыняе: яны смела акупавалі ўсю прастору вакол дыстанцыі. Трэнеры падаюць сваім выхаванцам ваду, даюць парады.

— Я таксама хацеў выступаць, ды не пашанцавала мне... — самотна прызнаецца латыш Арманс, дэманструючы пры гэтым загіпсаваную руку. — Вельмі хацеў выпрабаваць вашу трасу. Мне здаецца, што ў Беларусі яна больш складаная, чым у нас у Латвіі.

Я стаю на ярка-жоўтай мяжы. З аднаго боку хлопцы з цяжкасцю ўзнімаюцца ўгору. Перашкаджае гразь, трава, стомленасць, што паспела ўжо накапіцца...Нехта пераадольвае гэты адрэзак трасы седзячы на веласіпедзе, нехта ідзе пешшу, а веласіпед каціць побач з сабою. Дапускаецца і першае, і другое — каму як зручней. З другога боку, велаэкстрэмалы ўпэўнена імчацца «з вецярком».

Побач са мною стаіць мама Аляксандра Кучынскага. Па сумяшчальніцтве — яшчэ і яго трэнер.

— Я прывяла Сашу ў веласпорт, яшчэ калі яму было 12 гадоў... Цяпер абавязкова гляджу ўсе спаборніцтвы з удзелам Сашы. Адчуванні, якія пры гэтым узнікаюць, перадаць проста немагчыма: я ж і мама, і адначасова трэнер, — прызнаецца Любоў Сямёнаўна. Яна таксама адзначыла высокі ўзровень канкурэнцыі ў веласпорце. Прычым і сярод юніёраў, і сярод мужчын.

— Я веласпорт паважаю! У юнацтве я і сам любіў паганяць на веласіпедзе, — прызнаецца **каментатар чэмпіянату Беларусі па крос-кантры, вядучы спартыўны тэлекаментатар Беларусі Уладзімір НАВІЦКІ.** — І з Пекіна я вёў некалькі рэпартажаў са спаборніцтваў па веласпорце. Так што на гэтым чэмпіянаце я па прызванні.

На маё пытанне аб магчымасці ўдзелу беларускіх крос-кантрыйцаў на Алімпіядзе ў Лондане Уладзімір Мікалаевіч прызнаўся:

— Улічваючы тое, колькі ўвагі надаецца гэтай дысцыпліне, беларусы на Алімпіяду паедуць. Арганізатары сапраўды пастараліся: і экіпіроўка ў спартсменаў выдатная, і веласіпеды якасныя, і спонсараў знайшлі — а ў гэтай справе матэрыяльны бок вельмі важны!

У каментаванні падзей чэмпіянату па крос-кантры кампанію Уладзіміру Навіцкаму склаў каментатар тэлеканала «Еўраспорт Расія» Рэнат Хамідулін. Ад узроўню арганізацыі спаборніцтваў і падрыхтаванасці беларускіх камандаў Рэнат быў у захапленні:

— Я на чэмпіянат у другі раз прыехаў, аднак аргкамітэту ўжо сказаў: запрашайце і ў трэці раз! Прыеду з радасцю! Мне вельмі спадабаўся Мінск — спакойныя, ветлівыя людзі, чысты, утульны горад. Мне вельмі спадабаўся чэмпіянат — падрыхтоўка на вышэйшым узроўні. І мяне, шчыра кажучы, прыемна здзівілі беларускія крос-кантрыйцы. Вось калі ў Беларусі крос-кантры на такім узроўні (пры гэтых словах Рэнат паказвае дзесьці на ўзровень п'едэстала — **аўт.**), то ў Расіі — прыкладна вось такі (і паказвае на ўзровень ніжэй. — **Аўт.**) Мне нават неяк сорамна, што ў нас так не атрымліваецца, як у вас...

На міжнародных спаборніцтвах па крос-кантры перамогу атрымаў Сяргей Пятрэнка, адзіны прадстаўнік Украіны ў катэгорыі мужчын. Яму ўступіў беларус Яўген Лагун з Гомельскага клуба ГСЗ. Трэцім стаў таксама прадстаўнік каманды ГСЗ Аляксей Палушкін.

Такім чынам, беларускае чэмпіёнскае «золата» па крос-кантры дасталося Яўгену Лагуну, а «срэбра» Аляксею Палушкіну. Замкнуў тройку прызёраў Арцём Карытка з клуба МВЗ Мінскай вобласці.

Па выніках усіх заездаў мацнейшай стала каманда ГСЗ Гомельскай вобласці. Другім у рэйтынгу аказаўся клуб МВЗ Мінскай вобласці. Трэцяй у заліку стала каманда БАЛТРАНС Віцебскай вобласці.

Для Аляксандра Кучынскага, які праславіўся як веласіпедыст-шашэйнік, спаборніцтвы па крос-кантры сталі першымі ў жыцці. А таму пасля спаборніцтваў Аляксандр прызнаўся, што вялікіх надзей на гэты чэмпіянат не ўскладваў:

— Для мяне гэта перш за ўсё выдатная размінка перад заканчэннем сезона, гонкі для выпрацоўкі тэхнікі. І, вядома ж, я падтрымаў родную каманду. Як жа без гэтага!

Горкую ноту ў спаборніцтвы сярод мужчын прынесла дыскваліфікацыя Сяргея Новікава з клуба МВЗ Мінскай вобласці. Справа ў тым, што ў сярэдзіне шляху ў Сяргея, які ўпэўнена ішоў па дыстанцыі з нядрэннымі паказчыкамі, падвёў веласіпед... І яго калега па камандзе, убачыўшы, што прызавое месца яму не свеціць, аддаў свой веласіпед Сяргею...У выніку Сяргей Новікаў фінішаваў трэцім, паказаўшы сярод беларусаў другі вынік. Аднак за «маніпуляцыі» з веласіпедам маладога чалавека дысквалівфікавалі...

— На жаль, такое сапраўды часам здараецца, — каментуе здарэнне Аляксандр Чупін, які на чэмпіянат прыехаў з Малдовы не толькі ў якасці трэнера юніёраў, але і як удзельнік мужчынскай гонкі. — Калісьці ў мяне самога падобная сітуацыя была. Мой трэнер даў мне гаечны ключ «на ўсякі пажарны»... А мяне за гэта дысквалівфікавалі. Нічога не зробіш. Такія правілы — ты абавязаны і стартаваць, і фінішаваць на веласіпедзе. Усё, на што ты можаш разлічваць — ты і твой транспарт. Зламаўся? Выбачай, табе не пашанцавала... Таму часткова спаборніцтвы па крос-кантры — гэта яшчэ шанцаванне.

На маё пытанне, што б крос-кантрыец мог сам сабе пажадаць, Аляксандр задумаўся:

— Ведаеш, многія з нас прайшлі праз такія траўмы, што і казаць не хочацца... Таму адно з галоўных пажаданняў — не падаць!

**Алена БАРЫСЕВІЧ,**
**Фота аўтара.**

# КУЛЬТПАХОД У КІНО

**Напэўна, многія школьнікі, пачуўшы пра тое, што ў Мінск прыйшоў міжнародны фестываль дзіцячых і юнацкіх фільмаў, апынуцца перад дылемай: схадзіць у кіно ці зрабіць урокі. Урэшце, нядрэнна было б на час фестывалю абвясціць якія-небудзь пазачарговыя канікулы! Інакш гэта такая спакуса...**

Дзясяты, юбілейны «Лістападзік» пачынаецца а 14-й гадзіне 14 лістапада, але свята дзяцінства будзе доўжыцца цэлы тыдзень.

Адкрыццё фестывалю для дзяцей адбудзецца 14 лістапада ў кінатэатры «Піянер», дзе штодня будуць праходзіць конкурсныя паказы мастацкіх фільмаў. Але першым фестывальным фільмам, які будзе паказаны сёння, вызначылі стужку «Дзе конь, Вінкі?» над якой працавалі творцы з Галандыі і Бельгіі. Чароўная гісторыя дзяўчынкі па імені Вінкі — якраз і ёсць лепшы знак прадчування свята. Таму што дзяўчынка клапоціцца пра Амерыка. Гэта конь самага дзіўнага дзеда на свеце — святога Міколаса. І калі Вінкі вырашыла парушыць забарону і пакатацца на кані, ён ад яе збег. Але ж калі ён не знойдзецца да Калядаў, сумаваць будзе не толькі Вінкі, але і іншыя дзеці таксама...

Галоўныя інтрыгі конкурсных праграм — каму дастануцца прызы — патрабуюць умяшання чараўнікоў, якія будуць ацэньваць кожны фільм. Акрамя гледачоў такімі чараўнікамі стануць прафесіяналы. Журы кінематаграфістаў узначаліць Фёдар Папоў, расійскі рэжысёр і прадзюсар. Размяркоўваць прызы сярод анімацыйных прац будзе журы на чале з расійскім рэжысёрам-аніматарам Алегам Ужынавым.

Анімацыйная конкурсная праграма будзе праходзіць у «Доме кіно» штодня з 11 да 14 гадзін. Чатыры беларускія працы ў гэтым конкурсе: «Аповесць мінулых гадоў-3», створаная калектывам аўтараў на чале з Міхаілам Тумелем, «Жабка-падарожніца» Уладзіміра Пяткевіча, «Несцерка-3» Ігара Волчака, «Віфлеемская зорка» Аляксандра Гурулёва.

Але гэтым «Лістападзік» не абмежаваўся, вырашыўшы нагадаць дарослым, што ўсе яны выйшлі з дзяцінства, а ў дзяцей бываюць сур'ёзныя праблемы. Таму сёлета ўпершыню з'явіцца новая пазаконкурсная праграма «Дарослым пра дзяцей». Яна аб'яднала фільмы, якія дапамогуць дарослым адчуць свет сучасных дзяцей, якія могуць патрапіць у нянростыя сітуацыі, з якіх нават сталаму чалавеку складана знайсці выйсце. Гэтыя фільмы будуць дэманстравацца ў кінатэатры «Аўрора».

Кінатэатр «Салют» будзе чакаць тых, хто рады далучыцца да юбілею трох мастацкіх карцін, якія былі знятыя на «Беларусьфільме».

Сёлета ў праграмах «Лістападзіка» прадстаўлены кінапрацы з 29 краін, нават такіх, як ЗША, Аўстралія, Венесуэла, Мексіка, Іран, Рэспубліка Карэя, Японія, Кенія...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Андрэй ПАРАШЧАНКА:

# «ЛЮДЗІ Ў СТАЛІЦЫ КРЫХУ СПЕШЧАНЫЯ»

## СЛАВУТЫ БЕЛАРУСКІ ГАНДБАЛІСТ ПАРАЎНОЎВАЕ ГУЛЬНЮ МІНУЛАГА І СУЧАСНАСЦІ

**Капітан легендарнага гандбольнага мінскага СКА канца 80-х—пачатку 90-х гадоў, шматразовы чэмпіён Савецкага Саюза, пераможца еўрапейскіх Кубкаў Андрэй Парашчанка чалавек мэтанакіраваны. Таму калі ён стаў генеральным менеджарам гандбольнага «Дынама», заставалася толькі чакаць поспехаў яго каманды. Сёння «Дынама» на першым месцы ў чэмпіянаце краіны і сярод лідараў Балтыйскай лігі. Паводле слоў Андрэя Парашчанкі, гэта толькі пачатак...**

Андрэй ПАРАШЧАНКА верыць у светлую будучыню беларускага гандбола.

***— У спартсменаў рэгулярна пытаюцца, кім яны будуць пасля заканчэння кар'еры. А вы ведалі, што будзеце менеджарам гандбольнага клуба?***

— На розных этапах кар'еры былі розныя варыянты. Адразу былі планы застацца за мяжою. Аднак у асноўным усе думкі ішлі да таго, каб заняцца нейкай сваёй справай, ці, як кажуць, бізнэсам. Дакладна ведаў, што трэнерам не буду. Не таму, што не веру ў поспех. А таму, што хапіла эмоцый, якія я страчваў на пляцоўцы, калі яшчэ быў гульцом.

А наконт таго каб працаваць у структуры спартыўнага клуба ды яшчэ ў Беларусі, нават не марыў. Тым больш што былі прапановы па працаўладкаванні ў Іспаніі. Аднак я на той момант ужо вырашыў вярнуцца ў Беларусь, таму гэтыя прапановы нават не разглядаў.

***— І чым у такім выпадку вас прывабілі ў гандбольны клуб «Дынама»?***

— Прывабілі (калі можна тут ужыць гэтае слова) тым, што расказалі пра перспектывы будучага праекта, акрэслілі кола маіх абавязкаў. Магу сказаць, што я нядоўга раздумваў і даў згоду. Не апошнюю ролю адыгралі перамены сітуацыі ў беларускім гандболе ў лепшы бок. Маю на ўвазе граматныя ініцыятывы старшыні Федэрацыі гандбола Уладзіміра Канаплёва і з'яўленне прэзідэнцкага ўказа аб аказанні спонсарскай дапамогі гандбольным клубам. Гэта карэнным чынам змяніла сітуацыю ў айчынным гандболе.

***— З прыходам на пасаду генеральнага менеджара на вас лягла функцыя зацікавіць гандбалістаў. Што ў сваю чаргу казалі вы ім?***

— Безумоўна, было вельмі цяжка. У той час, калі я пачаў весці перамовы, трансферны рынак быў закрыты. Другое, што важна, клуба на той момант не існавала. Афіцыйна ГК «Дынама» быў зарэгістраваны 12 чэрвеня 2008 года. Таму расказваць гульцам, якія ўжо многа гадоў у спорце і так ці інакш знаёмыя з фінансавымі праблемамі, што ўсё будзе добра ў клубе, якога нават не існуе яшчэ, было даволі праблематычна. Але, на здзіўленне, практычна ніхто не адмовіўся. Хлопцы паверылі. І сёння магу сказаць, што няма нікога, хто быў бы расчараваны. Клуб выконвае і будзе выконваць усе свае абяцанні.

***— Чаму сярод балельшчыкаў нарадзілася такое меркаванне, што гандбол — выміраючы від спорту?***

— Зараз усё мяняецца. Але ні для каго не сакрэт, што гульнявыя віды спорту — гэта не тыя віды, на якіх можна зарабіць вялікія грошы. Ва ўсім свеце ёсць некалькі паспяховых прыкладаў — НХЛ, НБА, ліга амерыканскага футбола. Гэта залежыць ад умоў фінансавання і спонсарскай падтрымкі з боку дзяржавы. Менавіта таму гандбол найбольш паспяховы ў тых краінах, дзе дастаткова высокі агульны ўзровень жыцця — Даніі, Нарвегіі, Германіі, Славеніі...

***— Раней, здаецца, грошы знаходзіліся не на першым месцы, а поспех быў...***

— Проста быў іншы час. У нас былі пэўныя льготы. Наша зарплата не лічылася тысячамі, але была даволі высокая. Мы ездзілі на спаборніцтвы за мяжу, што было дадатковым стымулам. Каму шанцавала, давалі кватэры, раней яны не прадаваліся. А пад канец кар'еры можна было паехаць у сяброўскія Саветам краіны — ГДР, Венгрыю, Чэхію — паспяхова вазіць танны тавар і займацца свайго роду камерцыяй. Гэта важкія фактары, якіх цяпер проста не існуе. Сёння ніхто кватэру не дасць і не падорыць. Таму і цікавяцца ў першую чаргу заробкам.

***— Нават тады было цяжка з жыллём?***

— Кватэры атрымлівалі ў асноўным гульцы асноўнага складу. Некаторыя патрацілі сваю маладосць, пакалечылі сваё здароўе, а цяпер працуюць настаўнікамі фізкультуры ў школах. Гэта — рызыка вялікага спорту.

***— Такое адчуванне, што гандбалісты па сваім узроўні былі такія ж самыя, толькі самі па сабе былі прасцейшымі...***

— У дзяцей не было альтэрнатыў. У той час не было камп'ютараў, не было тых дасягненняў цывілізацыі, якімі насычаны сучасны свет. Нават піва падлеткам не прадавалі. А сёння здараюцца такія сітуацыі, калі чалавек не хоча атрымліваць нейкія павышаныя фізічныя нагрузкі. Ці ўвогуле з-за дажджлівага надвор'я не ў спартзалу ідзе, а садзіцца за камп'ютар, выходзіць ў інтэрнэт і гуляе з аднакласнікамі ў якую-небудзь анлайн-гульню.

***— А калі б я быў тым самым лянівым падлеткам, што б вы мне расказалі пра гандбол, як бы зацікавілі гэтым відам спорту?***

— Зацікавіць хлопца можна, аднак канчатковае рашэнне ўсё адно прымаць будуць яго бацькі. А апошнія, у сваю чаргу, будуць па розных крытэрыях ацэньваць кожны від спорту. Агульнавядома, напрыклад, што хакей вельмі дарагі занятак. Таксама важкі аргумент — гэта міжнародны поспех. Да прыкладу, возьмем мастацкую гімнастыку. Яны займаюцца ў суседняй з намі зале (у спарткомплексе па вуліцы Даўмана). Дык вось, пасля медальнага поспеху «мастачак» на апошняй Алімпіядзе, дзеці з бацькамі выстройваюцца ў чаргу, каб запісацца ў гэту секцыю. Можна быць упэўненым, што дасягненні БАТЭ на новы ўзровень паднімуць цікаўнасць да футбола.

***— Дарэчы, пра БАТЭ. Можа, быў бы сэнс стварыць моцны гандбольны клуб дзе-небудзь у правінцыі, у горадзе кшталту Барысава, дзе была б забяспечана падтрымка балельшчыкаў?***

— Так, у сталіцы людзі крыху спешчаныя вялікай колькасцю розных падзей. Пачынаць можна са спартыўных мерапрыемстваў і заканчваць канцэртамі. Аднак ёсць шэраг прычын, па якіх стварэнне гандбольнага клуба «Дынама» было магчыма менавіта ў Мінску. Асноўная з іх — гэта дэфіцыт залаў. У Беларусі сёння ёсць дзве залы міжнароднага ўзроўню — у Магілёве і Брэсце. Аднак там ужо «прапісаны» мясцовыя клубы. У Мінску такой залы проста не існуе.

***— А «СК Уручча»?***

— «СК Уручча» ўжо год закрываецца на рамонт. І цяпер там няма магчымасці праводзіць міжнародныя матчы. Раней нацыянальная зборная прымала там сваіх супернікаў, аднак сёння гандбалісты СКА-Мінск сядзяць, фігуральна кажучы, з клункамі ў распранальнях, гатовыя ў любы момант да пераезду.

***— Але і ваша зала разлічана ўсяго на 300 чалавек...***

— Зразумела, расказваць пра аншлаг, калі на матчы прысутнічае трыста чалавек, проста смешна. Аднак мы робім пэўныя крокі ў гэтым накірунку і ў матчах еўракубкаў, у якіх мы будзем удзельнічаць у наступным годзе, наш клуб будзе мець дастойную залу.

***— Напрыклад?***

— Гэта пакуль што маленькая тайна. Магу толькі сказаць, што гэта будзе мадэрнізацыя старога будынка.

***— А як усё ж прывесці ў залу балельшчыка? Як схіліць яго да выбару на карысць гандбола?***

— Працаваць і яшчэ раз працаваць з балельшчыкамі. Элементарна карыстацца шоу-праграмамі, рэкламай, анонсамі... Якое выйсце знайшлі ў НБА, калі спаборніцтвы былі на мяжы банкруцтва? Пачалі рабіць шоу. Будзем спрабаваць рабіць тое ж самае. Хоць гандбол і не такі відовішчны, як баскетбол.

**Юрась ШАЎЦОЎ.**

# ЧАМУ ПАСПЯХОВЫЯ ВЫПУСКНІКІ НЕ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА НА ВЫТВОРЧАСЦІ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)**

— Такая сітуацыя патрабуе глыбокага аналізу, — падкрэсліў Уладзімір Шчэрба. — Тым больш, што гэта праблема не толькі адукацыйная, але і сацыяльная. Мы бачым сваю задачу ў тым, каб школа, прычым не толькі прафесійна-тэхнічная, навучыла сваіх выхаванцаў адэкватнай самаацэнцы, пераканала іх выбраць шлях прафесійнага самавызначэння, які зусім неабавязкова павінен быць звязаны з навучаннем ў ВНУ. Моладзь не павінна разглядаць прафтэхшколу як тупік у сваёй прафесійнай кар'еры.

Да таго ж шанцы застацца беспрацоўнымі ў прадстаўнікоў рабочых прафесій — мінімальныя. 83 працэнты ўсіх вакансій, што маюцца на біржы працы, прызначаны для рабочых. З іншага боку, заказчыкі кадраў таксама маглі б больш актыўна папулярызаваць рабочую прафесію і займацца самарэкламай: арганізоўваць дні адчыненых дзвярэй як для падлеткаў, якія яшчэ толькі выбіраюць свой далейшы прафесійны шлях, так і для тых маладых людзей, якія ўжо заканчваюць прафтэхустанову.

**Работнікі з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй у найменшай ступені задаволеныя ўмовамі працы і заработнай платай, чым работнікі з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй.**

Яшчэ адна актуальная для сістэмы прафтэхадукацыі праблема — забеспячэнне навучальных устаноў інжынерна-педагагічнымі кадрамі. Апошнім часам акрэслілася выразная тэндэнцыя іх адтоку. Прычыны цалкам зразумелыя: сярэдняя заработная плата майстроў вытворчага навучання, якія працуюць на адну стаўку, з усімі надбаўкамі складае 400-450 тысяч рублёў, у той час як на вытворчасці заробкі ўдвая большыя. А ў наступным годзе з павелічэннем кантынгенту навучэнцаў кадравая праблема можа дадаткова абвастрыцца.

— Сёння якраз ідзе фарміраванне рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, таму неабходна неадкладна спрагназаваць на наступны год патокі выпускнікоў школ па ўзроўнях атрымання прафесійнай адукацыі з улікам заказаў на іх падрыхтоўку, магчымасцяў вучэбна-матэрыяльнай базы навучальных устаноў і педагагічных кадраў, — падкрэсліў намеснік міністра адукацыі Барыс Іваноў.

Зразумела, што не маглі ўдзельнікі калегіі абысці ўвагай і пытанне ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, ад якой у немалой ступені залежыць якасць падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў. Рашэннем Мінгарвыканкама за ўсімі ўстановамі прафесійна-тэхнічнай адукацыі былі замацаваны 95 базавых прадпрыемстваў і арганізацый, якія бяруць удзел ва ўмацаванні і мадэрнізацыі навучальных устаноў.

Набірае абароты мэтавая праграма «Абсталяванне»: сёлета на яе рэалізацыю ў Мінску было выдзелена 5 мільярдаў 298 мільёнаў рублёў. Але абсалютна відавочна, што аснасціць усе навучальныя ўстановы самым сучасным абсталяваннем немагчыма, паколькі тэмпы тэхналагізацыі вытворчасці надзвычай высокія. Між іншым, трэба не проста паспяваць за вытворчасцю, але і ў чымсьці яе апярэджваць. Менавіта таму Мінск вырашыў пайсці іншым шляхам — ствараць у прафтэхустановах адпаведнага профілю рэсурсныя цэнтры з канцэнтрацыяй і матэрыяльна-тэхнічных, і кадравых рэсурсаў. Ёсць ужо і першыя «ластаўкі»: рэсурсныя цэнтры створаны на базе прафесійна-тэхнічнага каледжа машынабудавання і ПТВ № 52 будаўнікоў. А на базе Мінскага ПТВ № 114 налета плануецца стварыць рэсурсны цэнтр па прафесіях дрэваапрацоўкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# КАМУ ДАСТАНЕЦЦА КУБАК ПРЭЗІДЭНЦКАГА КЛУБА?

**Другі год запар у Мінску праходзіць Міжнародны турнір па хакеі з шайбай сярод юнацкіх зборных камандаў «Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба». З 15 па 17 кастрычніка на ледовай арэне хакейнага клуба «Юнацтва-Мінск» будуць змагацца хакеісты з Беларусі, Латвіі, Літвы і Расіі. У параўнанні з мінулагоднім турнірам (U-16), узрост сёлетніх удзельнікаў — 16-18 гадоў. Упершыню на турнір прыедзе каманда Літвы. Урачыстае адкрыццё адбудзецца 15 лістапада ў 18.40 на ледовай пляцоўцы ў сталічным парку імя Горкага.**

Спаборніцтвы пройдуць па кругавой сістэме ў тры дні. 15 лістапада адбудуцца матчы Расія — Латвія (пачатак у 14.30), Беларусь — Літва (19.00), 16 лістапада пройдуць паядынкі Літва — Расія (12.45), Латвія — Беларусь (15.45), 17 лістапада згуляюць Латвія — Літва (12.30), Беларусь — Расія (15.30). Прызёры і лепшыя гульцы па амплуа атрымаюць каштоўныя падарункі ад рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Прэзідэнцкі спартыўны клуб» на ўрачыстай цырымоніі закрыцця, якая запланавана на 17 гадзін 17 лістапада.

Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — пераходны. Яго ўладальнікам летась стала каманда Расіі, якая паказала бліскучую гульню. Расійскія хакеісты паехалі дадому, атрымаўшы таксама статус лепшага абаронцы (Віталь Зотаў), нападаючага (Ігнат Земчанка) і бамбардзіра (Яўген Кузняцоў). Лепшым вратаром стаў галкіпер сярэбранага прызёру турніру каманды «Мінск-91» Аляксандр Барадуля. 3-е і 4-е месцы адпаведна занялі дружыны Латвіі і Беларусі.

Сёлета арганізатарамі турніру акрамя «Прэзідэнцкага спартыўнага клуба» выступілі Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя хакея».

**Алена КРАВЕЦ.**

# Педагог-псіхолаг — сябра і вучняў, і бацькоў

**Пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Педагог — псіхолаг года» стала Наталля Баранава, прадстаўніца сярэдняй школы № 12 горада Салігорска. Наталля — аўтар праграм «Выбар» па прафарыентацыі школьнікаў, «Мы» — па псіхалагічнай адаптацыі вучняў пры пераходзе з пачатковай школы ў сярэдняе звяно, а таксама аўтар праекта «Аптымізацыя дзейнасці педагога-псіхолага ва ўмовах агульнаадукацыйнай установы».**

Канкурэнцыю ёй у фінале рэспубліканскіх спаборніцтваў склалі яшчэ 20 педагогаў-псіхолагаў, якія працуюць у школах, гімназіях, сацыяльна-педагагічных цэнтрах, установах прафтэхадукацыі і ў Цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання. Усе яны з'яўляюцца пераможцамі і прызёрамі абласных і мінскага гарадскога конкурсаў прафесійнага майстэрства педагогаў-псіхолагаў.

Адметнасцю конкурсу стала сырокае прадстаўніцтва ў ім педагогаў-псіхолагаў з раённых і сельскіх устаноў адукацыі (72 працэнты ад агульнай колькасці ўдзельнікаў, за выключэннем мінчан). Канкурсантам давялося прайсці ў фінале прафесійнае тэсціраванне, арганізаваць самапрэзентацыю, прадаставіць сваё партфоліа, зрабіць аналіз педагагічнай відэасітуацыі, правесці адкрытае псіхалагічнае мерапрыемства ў незнаёмай аўдыторыі і выканаць экспрэс-заданне.

Сёлета службе педагогаў-псіхолагаў установу адукацыі спаўняецца 20 гадоў. Сёння ў Беларусі працуюць каля 4 тысяч спецыялістаў. Педагогаў-псіхолагаў рыхтуюць 14 устаноў адукацыі, у тым ліку 9 дзяржаўных і 5 прыватных. А ў абітурыентаў ёсць магчымасць выбіраць больш чым з 15 спецыяльнасцяў, звязаных з псіхалогіяй. Дарэчы, пераможца рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства працуе на пасадзе педагога-псіхолага ўсяго чатыры гады. Але гэта не перашкодзіла Наталлі Баранавай заваяваць прафесійнае прызнанне...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.36 | 16.12 | 8.36 |
| Віцебск — | 7.31 | 15.56 | 8.25 |
| Магілёў — | 7.26 | 16.02 | 8.36 |
| Гомель — | 7.16 | 16.05 | 8.49 |
| Гродна — | 7.50 | 16.28 | 8.38 |
| Брэст — | 7.45 | 16.34 | 8.49 |

### Месяц

***Апошняя квадра.***

***Месяц у сузор'і Блізнят.***

### Імяніны

***Пр.*** *Ульяны, Аляксандра, Дзмітрыя, Дзям'яна, Фёдара, Івана, Кузьмы, Сяргея, Якава.*

***К.*** *Андрэя, Лаўрэнція, Уладзіміра, Юзафа.*

## 14 лістапада

Дзве даты

**1939 год** — 3-я (нечарговая) сесія Вярхоўнага Савета БССР першага склікання прыняла Закон «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай ССР».

**1907 год** — нарадзілася Астрыд Ліндгрэн, самая папулярная ў свеце дзіцячая пісьменніца. Ёю створаны Карлсан, Пэпі ДоўгаяПанчоха і іншыя літаратурныя вобразы, якія сталі хрэстаматыйнымі ў сусветнай літаратуры.

Цытата дня

*Памяць — адзіны рай, з якога нас не могуць выгнаць».*

**Жан Поль (1763—1825), нямецкі пісьменнік.**

# ДЗЕНЬ КУЗЬМЫ, КУЗЬМІНКІ, ЗІМОВЫ КУЗЬМА-ДЗЯМ'ЯН

Свет і сусвет. Чалавека

● Спрадвеку святыя Кузьма і Даміян, якія ўшаноўваюцца ў гэты дзень па праваслаўным календары, сярод усходніх славян лічыліся ахоўнікамі рамёстваў, асабліва майстроў кавальскай справы і швачак. Гэты дзень для мужчын і жанчын станавіўся «пераходным» днём ад сельскагаспадарчых работ да зімовых саматужных промыслаў.

● Таксама святыя Кузьма і Дзям'ян сталі ахоўнікамі сямейнага ачага, святасці і непарушнасці шлюбу і сямейнага жыцця. У народзе гэтых святых параўноўвалі з кавалямі: «Боскія кавалі куюць вяселлі і вясельныя вянцы», «Боскія кавалі недагуляныя вяселлі дарабляюць».

● Таксама святых Касму і Даміяна лічылі ахоўнікамі курэй. У гэты дзень пасля ранішняга набажэнства курэй, гусей, качак апырсквалі святой вадой і прасілі божых памочнікаў захаваць птушыны «статак».

● На абед у гэты дзень абавязкова рыхтавалі курыцу: «На Кузьму-Дзям'яна курыцу на стол». У народнай культуры было шмат сакрэтаў і спосабаў дапамагчы самаму слабому або хвораму ў сям'і. Так, першы кавалак і сэрца курыцы ў гэты дзень трэба было аддаць менавіта такому чалавеку.

● «На Кузьму і Дзям'яна — курыная смерць» — так народная прыказка падказвала, што з гэтага дня звычайна пачыналі біць курэй на продаж.

● «Кузьма з Дзямянам на восець садзяць» — у гэты дзень трэба было пачынаць (а ў некаторых раёнах скончыць) малацьбу. «Дамалотная» каша была абавязковай стравай у гэты дзень.

● Кузьмінкі паўсюдна лічыліся таксама і дзявочым святам. Існаваў звычай, згодна з якім дзяўчына-нявеста ў гэты дзень лічыцца гаспадыняй дома. Яна рыхтавала святочныя стравы для сям'і, сярод якіх абавязкова павінна быць курыная лапша. «Досыць дзеўкам чужое піва варыць, час сваё распачынаць», — казалі пра дзяўчат на выданні.

● На тры дні святкавання Кузьмінак дзяўчаты знаходзілі памяшканне, дзе наладжвалі «ссыпчыну» (братчыну, талаку) і прымалі хлопцаў. Гэта былі свайго кшталту агледзіны нявестаў, пасля якіх у вёсках гулялі шмат вяселляў. У народзе так і казалі: «Падкузьміла дзеўка хлопца!».

● «Кузьмінкі — восені памінкі» — у народзе гэты дзень лічылі другой сустрэчай зімы (першая была 14 кастрычніка). І па гэтым дні прадказвалі будучае надвор'е:

*Снежны дзень абяцае будучай вясной вялікую паводку.*
*Кузьмінкі — покрыва са снегу (снежнае покрыва).*
*На Кузьму лісты на дрэвах трымаюцца — недарод напярадзе чакае.*
*Кузьма-Дзям'ян — кавалі, ставяць лёд на зямлі і вадзе.*
*Закуюць Кузьма з Дзям'янам — да вясны не раскуеш.*
*Кузьма закуе, а Міхайла (міхайлаўскія адлігі) раскуе.*
*Кузьма закуе, а Міхаіл (21 лістапада) раскуе.*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

**Наступствы рамонту ў вашай кватэры:**

☺ Вы выціраеце ногі не перад тым, як увайсці ў кватэру, а перад тым, як з яе выйсці.

☺ У вашым доме з'явіліся белыя прусакі.

☺ Ваша любімая кошка пераключылася з валяр'янкі на пакост.

☺ Вы прывыклі пераварочваць катлеты на патэльні шпатэлем.

☺ Заходзячы ў туалет, вы забываеце першапачатковую мэту і пачынаеце ўважліва вывучаць далучэнне ўнітаза і правяраць наяўнасць шчылін паміж кафлянымі плітамі.

☺ Вы выносіце смецце дзесяць разоў на дзень.

☺ Вы гладзіце сваю жонку шырокімі махавымі рухамі ўверх і ўніз.

☺ У сваю чаргу, жонка прывыкла замест шчочкі падстаўляць вам драбінкі.

☺ Дзе б вы ні апынуліся — у лесе, у моры, на перамовах з кіраўніком замежнай дзяржавы — усюды вас праследуе пах фарбы.

☺ Адзін раз у жыцці вы радуецеся, што ў вас маленькая кватэра.

☺ Кветкі, якія вы дорыце каханай, пахнуць ацэтонам.

☺

Днямі трое невядомых укралі «Запарожац», і зараз гэтых дурняў ведае ўвесь горад.

☺

**— Твая жонка сэксапільная?**
**— Напалову. Наконт сэксу не вельмі... Але пілуе!**

## Спорт-тайм

### САМСОНАЎ — БРОНЗАВЫ ПРЫЗЁР СУПЕРКУБКА

Беларус Уладзімір Самсонаў стаў бронзавым прызёрам розыгрышу Суперкубка Еўропы-2008 па настольным тэнісе, які праходзіў у падмаскоўным горадзе Віднае. У паядынку за трэцяе месца наш суайчыннік нанёс паражэнне шведу Ёргену Персану з лікам 4:2. У вырашальным матчы нямецкі тэнісіст Ціма Боль абгуляў аўстрыйца Вернера Шлагера — 4:1, і ў другі раз стаў уладальнікам кантынентальнага Суперкубка. Год таму Ціма Боль у фінале першага розыгрышу выйграў у Самсонава.

### З 59-ГА — НА 64-Е

У лістападаўскім рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (ФІФА) зборная Беларусі апусцілася з 59-га на 64-е, пры гэтым колькасць набраных ёй ачкоў зменшылася на 15 і цяпер складае 507. З моманту публікацыі кастрычніцкага рэйтынгу зборная правяла адну гульню — 15 кастрычніка прайграла ў Мінску зборнай Англіі ў матчы адборачнага турніру чэмпіянату свету 2010. Найвышэйшым дасягненнем каманды за ўсю яе гісторыю застаецца 57-е месца, якое зборная Беларусі займала з чэрвеня па верасень гэтага года. У тройцы лідараў лістападаўскага рэйтынгу Іспанія (1.657), Германія (1.413), Італія (1.356).

### БАТЭ ПЕРАЙГРАЎ «САВІТ»

У чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод камандаў вышэйшай лігі адбыўся перанесены матч 25-га тура паміж магілёўскім «Савітам» і барысаўскім БАТЭ. БАТЭ, які датэрмінова стаў пяціразовым чэмпіёнам краіны, перамог саперніка, які выбывае ў першую лігу, з лікам 1:0 (Сівакоў, 36, з пенальці).

### «ЮНАЦТВА» ПЕРАМАГЛО Ў ВОСЬМЫ РАЗ

Пасля амаль двухтыднёвага перапынку 12 лістапада аднавіўся Адкрыты чэмпіянат Беларусі па хакеі. Лідар першынства мінскае «Юнацтва» атрымала восьмую перамогу запар, абгуляўшы на сваёй пляцоўцы «Гомель», які ідзе на другім месцы, — 4:1. Дзеючы чэмпіён сталічны «Керамін» разграміў у сталіцы Латвіі «Рыгу-2000» — 6:0. Астатнія вынікі: «Нёман» (Гродна) — «Металургс» (Ліепая) — 1:2, «Хімвалакно» (Магілёў) — «Металург» (Жлобін) — 4:3, «Брэст» — «Агра» — 3:4. Турнірную табліцу ўзначальвае «Юнацтва» (55 ачкоў), на другім месцы «Гомель» (47), трэцяе «Хімвалакно» (44).

### ПУЦІЛА НА ПРАГЛЯДЗЕ Ў «ЛАКАМАТЫВЕ»

Маскоўскі «Лакаматыў» у хуткім часе можа папоўніцца паўабаронцам Антонам Пуціла, які выступае за «Гамбург». 21-гадовы гулец зборнай Беларусі, тэрмін арэнды якога ў «Гамбургу» заканчваецца 31 снежня і працягвацца не будзе, знаходзіцца ў маскоўскім клубе на праглядзе. Правы на Пуцілу належаць мінскаму «Дынама».

# ШЧЫК НА ЯЗЫК

Хочаце верце...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыццё з дзіцем поўна ўсялякіх забабонаў. Нават калі вы заўсёды сябравалі з чорнымі катамі, а расповеды пра «злыя вочы» лічылі бязглуздзіцай, тут задумаецеся: «А раптам сапраўды нешта існуе?». На мяне ніколі не звальвалася столькі ўсялякіх напасцяў, як у часы, калі я гуляла па вуліцы з каляскай. Ці з'явіцца на скуры нейкі незразумелы пякучы сып — сваякі загавораць: «Сурочылі!» . Ці раптоўна, калі ідзеш па роўным месцы, нешта хрусне ў назе — і пасля паўтара месяца кульгаеш, а пры гэтым трэба цягаць з пятага паверха каляску і браць на рукі малога. Ці распухне шчака, і не можаш не тое што есці, нават гаварыць, і праз боль і слёзы прымушаеш сябе праглынаць кашу, бо твайму немаўляці, якому ўсяго месяц, патрэбна малако. Ці на працягу тыдня трымаецца тэмпература пад 40, хоць да таго ніколі ў жыцці не тэмпературыла больш за два дні. Раней жа я была ўстойлівай да рознага роду балячак і амаль не мела пра іх ніякага ўяўлення. Як тут не задумацца: а раптам цяжарныя жанчыны, немаўляты і навaспечаныя мамкі найбольш неабаронены ад сурокаў? Мо недарэмна нашы продкі лічылі роды памежным станам паміж гэтым і тым светам, і таму немаўляты энергетычна слабыя. Прынамсі, старэйшае пакаленне моцна верыць ва ўсялякія забабоны, асабліва ж многа прыхільнікаў усёмагчымых супрацьсурочных абрадаў у вёсцы. Мае вясковыя «настаўнікі па засцярогах дзіцяці» так і папярэджвалі: « У нас без шпількі дзіцяці нельга хадзіць. Гэта ў горадзе на ўсё забыліся, а тут яшчэ як вядзьмараць: і сурокі наводзяць, і хлапцоў прычароўваюць, і праклёны насылаюць».

Жыццё з немаўлятамі — крохі свет, сатканы з нейкай невядомай матэрыі, а ў ёй хапае і паганскага і хрысціянскага. З аднаго боку, гэта розныя замовы, дулі ў кішэнях і абавязковыя шпількі на матчыной і дзіцячай вопратцы, з другога — хрышчэнне: сталыя людзі кажуць, пакуль не перахрысціш дзіця, яно будзе хварэць, раяць імя малым даваць па святах (святы, у дзень якога нарадзілася малое, будзе заступнікам, і тады дзіця расце здаровым і шчаслівым). Міжволі пачынаеш сачыць за сваімі рухамі, словамі (каб не падхапіць якую шкоду сабе ці малому), прыглядаца да людзей, якія трапляюцца на шляху, вышукваючы носьбітаў «злога вока», прыслухоўвацца да бабульчыных парад, якія ёй у сваю чаргу перадала прабабка. Так, старая раіць абавязкова перахрышчваць дзіця перад прагулкай, каб з ім нічога не здарылася. Не паказваць кожнаму сустрэчнаму малога, а калі хтосьці цікаўны пачне касавурыцца на яго (вы заўважыце, што часта прахожыя так і імкнуцца зазірнуць у каляску), каб засцерагчы немаўля ад сурокаў, трэба сказаць «Шчык на язык, соль табе ў вочы». Прычым мая бабулька раіць гэтымі словамі засцерагацца ад усіх людзей, нават ад вельмі добрых сяброў і сваякоў, бо яны могуць нашкодзіць дзіцяці міжволі, самі таго не жадаючы. Часта мамы ці бабулі вылучаюць асобаў, якія дрэнна ўплываюць на іх малога. Так, мы заўважалі, што кожны раз пасля сустрэчы з адной і той жа жанчынай наш карапузік пачынаў кідацца начамі ці хварэць. У немаўлят нашых сваякоў былі падобныя адмоўныя рэакцыі.

Сёння многія мамкі імкнуцца трымацца падалей ад цікуючых на лавачках бабулек і ад незразумелых асобаў, з азлобленымі, ліслівымі, ці ніякаватымі тварамі, якія сам-насам швэндаюцца па вуліцы і часам мармычуць нешта сабе пад нос ці ні з таго ні з сяго пачынаюць лаяцца. І калі пасля такіх сустрэчных з малым нешта здараецца, так і хочацца паклікаць на дапамогу бабульку. Яна звісае над немаўляткам, нешта шэпча ад сурокаў, ад спуду — і дзіцяці становіцца лягчэй, яно перастае крычаць і спакойна спіць уначы. У экстранных выпадках, калі дзіця сурочылі, бабулька раіць, каб маці працірала тройчы тварык немаўляці тыльным бокам майкі, якая на ёй апранутая, і прыгаворвала: «Якая маці радзіла, такая адхадзіла»... Пры сустрэчы з мамкай, якая вядзе хворае дзіця, каб малы не перахапіў чужую хваробу, трэба вымавіць: «Няхай маё ваўчаня з'есць тваё качаня».

Яшчэ адна з бабульчыных парад: ніколі не хваліцца малым. Узгадваю пра суседку па палаце ў радзільным доме. Вось яна весела распавядае па тэлефоне пра свайго цудоўнага міленькага сыночка, радуецца, што яму добра і яна хутка яго забярэ, а крыху пазней наведвае немаўля ў рэанімацыйным пакоі і вяртаецца са слязьмі: яго стан пагоршыўся. А колькі мамак скардзіліся, што пасля таго, як яны пахваліліся, што іх малыя не крычаць начамі, давялося зусім забыць пра спакойны сон ад захаду да світання.

Адно з прымхлівых правілаў, якога на сёння прытрымліваюцца многія сем'і, — першы раз дзіця павінна купаць жанчына ва ўзросце, калі яна не можа зацяжарыць. Асабліва гэта важна пры першым купанні дзяўчынак, каб пасля крытычныя дні ў іх праходзілі без болю. І як кажуць сталыя людзі, дзяцей нельга купаць у вялікія хрысціянскія святы, у гэтыя ж дні не трэба ім стрыгчы пазногці і валасы. Перад купаннем трэба перахрышчваць і дзіця, і ваду, каб усё прайшло гладка і малое не капрызіла і не захварэла.

Запэцканыя дзіцячыя рэчы нельга кідаць на падлогу, каб малое не падхапіла хваробу. А памытыя пялёнкі і вопратку не варта пакідаць на ноч сохнуць на вуліцы (бо малое спаць не будзе). Ёсць яшчэ і такі забаўны прыгавор, калі малому заціскаюць на некалькі секунд носік: «каб спала ды прыбывала». А калі немаўля ўсміхаецца ў сне, сталыя людзі кажуць, што гэта яго анёлы забаўляюць.

Прынамсі, вы ведаеце, адкуль пайшлі выразы пра тое, што дзіцяці прыносіць бусел, ці што яго знаходзяць у капусце? Так нашы продкі засцерагаліся ад злых духаў, маўляў, тыя падумаюць, што немаўля не роднае, і не будуць чыніць яму шкоды. Існаваў нават такі рытуал, калі бацькі нованароджанага загадзя дамаўляліся з пэўнай кабетай, што яна ў назначаны час забярэ дзіця, пакінутае ў агародзе ці за дзвярыма, прынясе ў хату, быццам вось каля вас знайшла. «Падкідышу» духі не будуць шкодзіць. Ды звярыныя ці брыдкія мянушкі, ад якіх пасля пайшлі адпаведныя прозвішчы, даваліся дзецям, зноў жа каб заблытаць усялякіх духаў. А ўвяце старажытнага беларуса, які пакланяўся паганскім багам і верыў, што свет напоўнены рознымі добрымі і дрэннымі істотамі. Як жа тут не папрыдумваць усялякіх дзіцячых шкоднікаў, калі цяжка вытлумачыць, з чаго раптам дзіця пачынае моцна крычаць ці адкуль выпаўзаюць ягоныя хваробы. Адной з такіх істот у беларусаў была начніца (праклятая кабета, якая пры жыцці не мела сваіх дзяцей, а пасля смерці не дае спаць немаўлятам: шчыпае, торхае ці насылае на іх хваробы). Засцерагаліся ад яе тым, што рабілі лялечак з брудных хустак і ставілі на кожным акне са словамі: «Глядзіце, лялечкі, каб мой маленькі спаў». Прынамсі, у Расіі

## ПАНЯДЗЕЛАК, 17 ЛІСТАПАДА

**5.30** Дак. фільм «Дзікае паляванне».
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**6.05, 7.05, 8.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 7.45, 18.50, 1.05** Зона Х.
**7.30, 8.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.30** У свеце матораў.
**9.05, 15.25** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10** Nota Bene.
**9.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Мой службовы раман».
**11.00, 17.50 Серыял «Родныя людзі».**
**12.10 Меладрама «Дні надзеі».**
**14.05 Відэафільм «Анатоль».**
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.00** Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
**16.50 Серыял «Гарачы лёд».**
**19.30** Арэна.
**19.55** Ток-шоу «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 1.50 Серыял «Доктар Хаўс».**
**23.05** Дзённік Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад-2008».
**23.15 Баявік «Снайпер».**
**1.15** Дзень спорту.
**1.25** «Будні чэмпіёнаў». Кацярына Карстэн.

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00. 20.30, 22.55, 0.50** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.45** Ералаш.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.10, 1.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольная закупка».
**11.50** Малахаў+.
**13.10** «Зразумець. Дараваць».
**13.50** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Імперыя пад ударам».**
**16.15** «Бітва гарадоў».
**17.30** «Жарт за жартам».
**18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Выбар».
**22.00 Серыял «След».**
**23.15** «Адваротны адлік». «У пошуках страчанага. Маўчанне карцін».
**23.50** Бокс. Лепшыя баі. Д. Дзіяз — Э. Маралес.

**6.55** Ранішняя падзарадка.
**7.55, 16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**8.25** Тэлебарометр.
**8.45** Усё аб бяспецы.
**9.10** У гэты дзень.
**9.15, 16.05** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.05, 17.30 Серыял «Спадчынніца».**
**10.55 Камедыя «Няма чаго губляць».**
**12.35** Слова пісьменніка.
**13.00 Серыял «Расплата за грахі».**
**13.50** Бухта капітанаў.
**14.30** Мультсерыял «Новыя прыгоды Віні-Пуха»..
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Гіпноз.
**18.35** Навіны культуры.
**18.50 Серыял «Участак-2. Зачараваны ўчастак».**
**20.05** Беларуская часінка.
**21.05** Калыханка.
**21.30 Серыял «Д'Артаньян і тры мушкецёры». 1-я серыя.**
**23.15.** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд туру.
**0.15** Хакей. Формула гульні.

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30** «Тыдзень».
**9.30** «Вялікае сняданне».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Наша справа».
**10.50 Серыял «Жыццё працягваецца».**
**11.45 Серыял «Трое супраць усіх 2».**
**12.35** «Ваенная тайна».
**13.50** «Мой дом».
**14.20** «Горад дзяцінства».
**14.35, 0.10** «Крутыя рабяты».
**15.35** «Я — падарожнік».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25 Серыял «Багатая і любімая».**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.35 Маст. фільм «Скарб».**
**23.00 «Салдаты. Дэмбельскі альбом». Серыял.**
**0.05** «Закон і крымінал».
**0.20** «Сталічны футбол».
**0.50** «Гучная справа».

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05, 6.05, 7.05, 1.05, 2.30** Садружнасць live.
**5.30** «Жаночы часопіс».
**6.35** «Удачная пакупка».
**6.45** «Цік-так».
**7.30, 19.30** «Агульны інтэрэс».
**8.05, 1.30** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
**9.05** «Разам».
**10.05 Маст. фільм «Адчыніце, паліцыя».**
**12.05, 23.20 Маст. фільм «На цёмным баку Месяца (Кодэкс маўчання)».**
**14.05** Мультсерыял «Рэдвал».
**14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**15.20** Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
**15.55** «Білет на сёння».
**16.05, 4.00** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.05 Серыял «Каханне як каханне».**
**18.20** «Акцэнты».
**18.30 Серыял «Доктар Жывага».**
**20.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**21.20, 3.00 Серыял «Блізняты».**

**7.00, 10.50, 16.55, 19.45** Навіны кіно.
**7.10** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.25, 23.20** «Метэапрагноз».
**7.30 Маст. фільм «Яшчэ адна з роду Болейн».**
**9.00** «Клуб-700».
**9.20** «К-гульні».
**9.30** «К-відэа» для дзяцей.
**9.50, 19.50 Серыял «Закон Мэрфі».**
**10.50** «Навіны кіно».
**11.00 Серыял «Сям'я Кардзье».**
**12.45** «8 самых».
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**16.30** «Мультпарад».
**17.00 Серыял «Свавольнікі».**
**17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».**
**19.15** «Мой любімы гадаванец».
**20.45** «Вечарніца».
**20.55** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**21.05 Трылер «Сны».**
**23.00** «Стары магнітафон».

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.10 Маст. фільм «Скарбы палаючых скал».**
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.35** Пакой смеху.
**12.30 Маст. фільм «Крымінальны аддзел».**
**13.50, 16.50, 18.50, 22.50** Навіны—Беларусь.
**14.20** Дак. фільм «Страсці па дыеце».
**15.15, 23.20 «Кулагін і партнёры».**
**15.50** Суд ідзе.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**19.35 Серыял «Чараўніцкае каханне».**
**20.40 Серыял «Казакі-разбойнікі».**
**21.40 Серыял «Махляры».**
**23.00** «Весткі+».
**23.55** Дак. фільм «Галоўны пасля Бога».

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Родныя людзі».**
**10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**11.35 Маст. фільм «Чорны капітан».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Меладрама «Раганосец».**
**15.00** Мультфільм.
**15.15** «Апошні званок Нестара Пятровіча. Міхаіл Конанаў».
**16.25** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі—спорт.
**16.55, 5.40** «Засадны полк». «Аляксей Яшын».
**19.45, 1.55 Серыял «Чараўніцкае каханне».**
**20.30, 3.45 Серыял «Казакі-разбойнікі».**
**21.15, 4.50** «Гарадок».
**22.00** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**22.20** «Астравы». Венедыкт Ерафееў.
**23.00, 4.30** «Весткі+».
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**6.05** «Сёння раніцай».
**8.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**9.05** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.30 Маст. фільм «Мёртвыя душы».**
**15.05** «Рускія не здаюцца!».
**15.30, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45 Серыял «Псеўданім «Албанец»-2».**
**21.55** «І зноў прывітанне!».
**23.30 Серыял «Пракляты рай-2».**
**0.25 Серыял «Медыум».**
**1.10** «Школа зласлоўя».

**5.00** Канал «Настрой».
**7.30, 17.15** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**7.35, 14.30, 20.05, 0.45, 2.15 Маст. фільм.**
**9.20, 17.20** Мультпарад.
**10.10, 14.10, 16.50** Пятроўка, 38.
**10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30** Падзеі.
**10.45** «Пастскрыптум».
**11.55** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Хуткая смерць».
**12.25** «У цэнтры падзей».
**13.45** Дзелавая Масква.
**15.30** Дак. фільм «Хто загубіў мая».
**17.50** Дак. серыял «Каралі мафіі».
**18.55** «Рэальныя гісторыі». Худыя і стройныя.
**21.05** «У цэнтры ўвагі». «Самаабарона па-руску».
**21.55** Момант ісціны.
**22.50** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.25** «Нічога асабістага». Ці можна верыць сацыёлагам?
**0.10** Пра рэгбі.
**4.00** Дак. фільм «Алімпіяда-80. Погляд з будучыні».

**9.30** Мотаспорт па выхадных.
**9.45** Аўтаспорт. Клас «Турынг».
**10.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны (U-17).
**11.45, 16.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010.
**14.30** Футбол. Афрыканская Ліга чэмпіёнаў. Фінал.
**19.00, 0.00** Футбол. Еўрагалы.
**19.45, 0.45** Снукер.
**21.00** Байцоўскі клуб.
**2.00** Экстрэмальны спорт.

### 23.15 ФІЛЬМ ДНЯ

## «СНАЙПЕР» (ЗША, 1993 г.)

У джунглі Панамы пасланы два снайперы, каб знішчыць лідара паўстанцкай арганізацыі. Аднак надзея лёгка дасягнуць мэты рушыцца, калі яны сутыкаюцца з варожымі джунглямі. Малады падазрае ў напарніку бязлітаснага чалавека, якім ён і сам можа стаць, у той час як вопытны снайпер бачыць у маладым спадарожніку таго, кім ён мог бы быць, але так і не стаў...

**Рэжысёр** — Луіс Льёса. **У ролях:** Том Бераньджэр, Білі Зэйн, Дж. Т. Уолш, Эйдэн Янг, Кен Рэдлі, Дэйл Дай, Рычард Лайнбэк.

## СЕРАДА, 19 ЛІСТАПАДА

**5.15 Серыял «Тайны следства».**
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.20, 23.55** Навіны.
**6.02, 7.05** Прэс-агляд.
**6.05, 1.20** Дзень спорту.
**6.15, 7.10, 8.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 7.45, 18.10, 1.10** Зона Х.
**7.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**9.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10 Серыял «Монтэкрыста».**
**10.05, 16.40 Серыял «Гарачы лёд».**
**11.00 Серыял «Родныя людзі».**
**12.10** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**13.05 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**13.55** Альманах падарожжаў.
**14.25, 1.30 Серыял «Клініка».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Дак. цыкл «Нябачны фронт».
**15.40 Серыял «Тайны следства-2».**
**17.50** Зямельнае пытанне.
**18.55** Футбол. Таварыскі матч. Кіпр — Беларусь.
**20.55** «Спортлато 5 з 36».
**21.00** Панарама.
**21.50, 1.55 Серыял «Доктар Хаўс».**
**23.00** Дзённік Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад-2008».
**23.15 Камедыя «Нічога страшнага».**

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 1.25** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05, 18.55 Серыял «Таццянін дзень».**
**10.00 Серыял «Пяты вугал». Заключная серыя.**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 1.40** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольная закупка».
**11.50** Малахаў+.
**13.10** «Зразумець. Дараваць».
**13.50** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Імперыя пад ударам».**
**16.15 Серыял «Агонь кахання».**
**17.10** «Няхай гавораць».
**18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Сінія ночы».**

**6.55** Ранішняя падзарадка.
**7.55. 17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**8.25, 18.50 Серыял «Участак-2. Зачараваны ўчастак».**
**9.25** У гэты дзень.
**9.30, 16.05** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.20, 17.30 Серыял «Спадчынніца».**
**11.00** Свая музыка.
**11.40** Спорт-кадр.
**12.05, 21.25 Серыял «Д'Артаньян і тры мушкецёры».**
**13.45 Серыял «Расплата за грахі».**
**14.30** Мультсерыял «Новыя прыгоды Віні-Пуха».
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Космаполітэн». Відэаверсія.
**18.35** Навіны культуры.
**20.00** Беларуская часінка.
**21.10** Калыханка.
**22.55** «Іншыя». «Каханне і галубы».
**23.30 Камедыя «Джокер».**

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 0.25** «Закон і крымінал».
**6.25, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30** «Аўтапанарама».
**8.50, 20.50 Серыял «Шырокая рака».**
**9.50** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40, 14.20, 0.30** «Крутыя рабяты».
**10.50 Серыял «Жыццё працягваецца».**
**11.45, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».**
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.30 Серыял «Элен і сябры-2».**
**15.30, 23.20 «Салдаты. Дэмбельскі альбом». Серыял.**
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30** «Скардзіцца дазволена».
**22.00** «Мінск і мінчане».
**23.00** «StartUp!».
**0.40** «Зоркі спорту».
**1.05** «Дэтэктыўныя гісторыі».

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05, 6.05, 7.05, 1.05, 2.30** Садружнасць live.
**5.30** Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
**6.35** «Удачная пакупка».
**6.45** «Цік-так».
**7.30, 19.30** «Дзень пасла».
**8.05, 1.30** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
**9.05, 20.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**10.05, 18.30 Серыял «Доктар Жывага».**
**12.05, 23.20 Маст. фільм «На цёмным баку Месяца (Кодэкс маўчання)».**
**14.05** Мультсерыял «Рэдвал».
**14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**15.20** «Планета Vision прадстаўляе...».
**15.55** «Білет на сёння».
**16.05, 4.00** «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
**17.05 Серыял «Каханне як каханне».**
**18.20** «Акцэнты».
**21.20, 3.00 Серыял «Блізняты».**
**22.30** Дак. фільм «Кома гэта праўда».

**7.00** Навіны кіно.
**7.10, 10.55, 21.05, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.15 Баявік «Няма куды бегчы».**
**9.00** «К-відэа» для дзяцей.
**9.30** «Адшукваецца адпачынак».
**9.50, 19.50 Серыял «Закон Мэрфі».**
**11.00 Маст. фільм «Хор».**
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**16.30** «Мультпарад».
**17.00 Серыял «Таямнічае возера».**
**18.00 Серыял «Жыццё Клима Самгіна».**
**19.15** «Хіт-парад тэлечата».
**19.40** «К-гульні».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**21.10 Маст. фільм «Вальмон».**

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**9.10, 19.35 Серыял «Чараўніцкае каханне».**
**10.05, 20.40 Серыял «Казакі-разбойнікі».**
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30, 21.40 Серыял «Махляры».**
**12.25 Маст. фільм «Каменны крыж».**
**13.50, 16.50, 18.50, 22.50** Навіны—Беларусь.
**14.20** Дак. фільм «Іван Грозны з душой Дон Кіхота. Мікалай Чаркасаў».
**15.15, 23.20 «Кулагін і партнёры».**
**15.50** Суд ідзе.
**17.25** «Спецыяльны карэспандэнт».
**17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**23.00** «Весткі+».
**23.55** Дак. фільм «Галадамор-1933. Нявывучаныя ўрокі».

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Родныя людзі».**
**10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**11.30** «Апокрыф».
**12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Казакі-разбойнікі».**
**13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.20** Весткі—Масква.
**13.35 Маст. фільм «З вечара да поўдня».**
**14.45** «Тэатральны летапіс». Аляксандр Збруеў. Частка 2-я.
**15.15** «Сталінградская бітва. Непераможныя». Фільм 2-і.
**16.25** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.45, 0.10, 6.40** Весткі—спорт.
**16.55, 5.40** «Хто там...».
**19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».**
**21.15, 4.50** «Гістарычныя хронікі». «1969. Карней Чукоўскі».
**22.00** Весткі—Санкт-Пецярбург.
**22.20** «Рамантыка раманса».
**23.00, 4.30** «Весткі+».
**23.20, 2.40** Навіны культуры.
**23.40, 6.10** «Начны палёт».

**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**6.05** «Сёння раніцай».
**9.00** «Дачны адказ».
**10.20** «Пакой адпачынку».
**10.45** «Галоўная дарога».
**11.15 Серыял «Уцёсаў. Песня даўжынёй з жыцця».**
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.30 Серыял «Вісякі».**
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30, 18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**19.45 Серыял «Псеўданім «Албанец-2».**
**21.55** «Залатая вутка».
**23.30 Серыял «Пракляты рай-2».**
**0.25 Серыял «Медыум».**

**5.00** «Настрой».
**7.30, 10.50, 11.55, 14.30, 15.30, 20.05, 23.25, 1.30 Маст. фільм.**
**10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30** Падзеі.
**10.45, 17.15** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**12.55** Скрытая пагроза».
**13.45** «Рэзананс».
**14.10, 16.50** Пятроўка, 38.
**17.20** Мультпарад.
**17.50** Дак. серыял «Каралі мафіі».
**18.55** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Бяжы, Сярога, бяжы!». Фільм 1-ы.
**21.05** «Садам Хусейн. Апошнія дні».
**21.55** «Справа прынцыпу».
**22.50** Падзеі. 25-я гадзіна.
**3.40** Дак. фільм «Хто загубіў мая».
**4.40** Мультфільм «Певень і фарбы».

**9.30** Вось гэта дзіва!!!
**10.00, 14.30, 19.15, 0.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010.
**12.30** Снукер.
**13.45, 19.00** Футбол. Еўрагалы.
**17.00, 20.00, 1.00** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын (U-20).
**22.00** Выбранае па серадах.
**22.10** Навіны коннага спорту.
**22.15, 23.00** Гольф.
**22.20** Парусны спорт.
**22.55** Яхт-клуб.
**2.00** Аўтаспорт. Клас «Турынг».

### 21.10 ФІЛЬМ ДНЯ

## «ВАЛЬМОН» (ЗША — ФРАНЦЫЯ, 1989 г.)

Маркіза дэ Мертэй — геніяльны «лялькавод» інтымных адносінаў у вышэйшым свеце. Бліскучы Вальмон — герой донжуанскага спісу спакушаных і пакінутых. Вельмі востры водар далёкай эпохі распаўсюджваюць куртуазная спакуса, здрады, дуэлі, забойствы.

**Рэжысёр** — Мілаш Форман. **У ролях:** Колін Ферт, Анэт Бенінг, Мэг Цілі, Файруза Балк, Шан Філіпс, Джэфры Джонс, Фабія Дрэйк.

## АЎТОРАК, 18 ЛІСТАПАДА

**5.10, 15.40 Серыял «Тайны следства».**
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**6.02, 7.05** Прэс-агляд.
**6.05, 1.20** Дзень спорту.
**6.15, 7.10, 8.10** Добрай раніцы, Беларусь!
**6.45, 7.45, 18.50, 1.10** Зона Х.
**7.30, 8.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.35** Арэна.
**9.05. 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».**
**10.05, 16.40 Серыял «Гарачы лёд».**
**11.00, 17.45 Серыял «Родныя людзі».**
**12.10** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**13.05 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**13.50** Дак. цыкл «Нябачны фронт».
**14.20, 1.30 Серыял «Клініка».**
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Зорны старт.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.50, 2.00 Серыял «Доктар Хаўс».**
**23.05 Драма «Тайнае жыццё слоў».**

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 1.10** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Чакай мяне.
**9.55 Серыял «Пяты вугал».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 1.25** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Дараваць».
**13.50** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Імперыя пад ударам».**
**16.15 Серыял «Агонь кахання».**
**17.10** «Няхай гавораць».
**18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**18.55 Серыял «Таццянін дзень».**
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Сінія ночы».**
**22.15 Серыял «След».**
**23.30 Серыял «Застацца ў жывых».**
**0.25** Тэорыя неверагоднасці. «Каго выбірае Фартуна».

**6.55** Ранішняя падзарадка.
**7.55, 16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**8.25, 18.50 Серыял «Участак-2. Зачараваны ўчастак».**
**9.20** У гэты дзень.
**9.25, 16.05** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**10.15, 17.30 Серыял «Спадчынніца».**
**11.05** Анекдот. LAD.
**11.20** Хакей. Формула гульні.
**11.50** «Спорт, спорт, спорт...». Бернд Штанге.
**12.15, 21.30 Серыял «Д'Артаньян і тры мушкецёры».**
**13.45 Серыял «Расплата за грахі».**
**14.35** Мультсерыял «Новыя прыгоды Віні-Пуха».
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Бітва экстрасэнсаў.
**18.35** Навіны культуры.
**20.05** Беларуская часінка.
**21.05** Калыханка.
**23.25** Спорт-кадр.
**0.00** Хакей. НХЛ. Дэтройт — Эдмантан.

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 0.25** «Закон і крымінал».
**6.25, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30 Маст. фільм «Скарб».**
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40, 14.20, 0.30** «Крутыя рабяты».
**10.50 Серыял «Жыццё працягваецца».**
**11.45, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».**
**12.35** «Гучная справа».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.30 Серыял «Элен і сябры-2».**
**15.30, 23.20 Серыял «Салдаты. Дэмбельскі альбом».**
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.30** «Званая вячэра».
Дыябет I тыпу, пра які ідзе гаворка ў згаданых вышэй выпадках, фактычна немагчыма прадухіліць, паколькі ён развіваецца ў дзяцей і маладых людзей у выніку пэўных «паломак» імуннай сістэмы, што можа назірацца на фоне віруснай інфекцыі, напрыклад, грыпу. А вось значна больш распаўсюджаны цукровы дыябет II тыпу прадухіліць можна. Гэта цяжкае захворванне напрамую звязана з парушэннем абмену рэчываў. Абсалютная большасць такіх хворых пакутуе ад атлусцення. Такім чынам, першы крок да прафілактыкі і лячэння цукровага дыябету II тыпу — барацьба з лішняй вагой.

Спажыўныя рэчывы, якія трапляюць у наш арганізм з ежай, адпраўляюцца пасля ператраўлівання ў кроў. У выніку павялічваецца канцэнтрацыя глюкозы, а ў падстраўнікавай залозе ўзмацняецца выдзяленне інсуліну — гармону, які разам з іншымі рэчывамі спрыяе выкарыстанню глюкозы ўсімі тканкамі і падтрымлівае яе канцэнтрацыю ў норме. Пры дыябеце I тыпу клеткі, якія выпрацоўваюць інсулін, разбураюцца (па прычыне імуннай паломкі), з-за чаго ў крыві назапашваецца лішак глюкозы. Пры дыябеце II тыпу вышэйзгаданыя клеткі дрэнна функцыянуюць і вырабляюць недастатковую колькасць інсуліну. Прымітыўна кажучы, у гэтым выпадку парушаецца «дастаўка» і «баланс» глюкозы ў тканках арганізма, з-за чаго апошні пачынае «галадаць».

Паводле слоў спецыялістаў, хворыя на цукровы дыябет могуць жыць абсалютна паўнацэнным жыццём пры адной умове — самадысцыпліне, жаданні не проста наведваць «школы дыябетыкаў», але і вытрымліваць усе рэкамендацыі ўрачоў. Што датычыцца прафілактыкі цукровага дыябету II тыпу, то кожны, хто не хоча змагацца з лішняй вагой і хоча пазбегнуць захворвання, павінен звяртаць увагу на некалькі простых рэчаў.

**1. Глікемічны індэкс.** Высокі глікемічны індэкс мае ежа, якая спрыяе раптоўнаму павышэнню глікеміі — узроўню глюкозы ў крыві. Калі глюкоза хутка трапляе ў клеткі, мы хутчэй пачынаем хацець есці. Высокі глікемічны індэкс маюць, напрыклад, вараная бульба, французскі батон, крэкеры, вафлі. Пры ўжыванні прадуктаў з нізкім глікемічным індэксам паглынанне глюкозы адбываецца павольна і насычэнне працягваецца даўжэй. Нізкі глікемічны індэкс маюць, напрыклад, соя, цэльназерневыя спагеці, фасоля, яблыкі і асабліва крупы, якія не дазваляюць развіцца атлусценню.

**2. Дробнае харчаванне.** Дыетолагі раяць не дапускаць працяглых перыядаў галадання. Гэта будзе спрыяць адсутнасці выпадкаў пераядання, што ў сваю чаргу стамляе падстраўнікавую залозу і спрыяе развіццю дыябету. Паміж асноўнымі прыёмамі ежы рэкамендуецца прымаць прадукты, якія ўтрымліваюць кальцый: нятлусты ёгурт, кавалак лёгкага пастэрызаванага сыру.

**3. Перамены для ўсіх.** Замена цукру на больш здаровыя прадукты — задача кожнага. Усе, ад унукаў да бабуль, павінны прытрымлівацца адналькава здаровага рэжыму харчавання. Не мае сэнсу прапаноўваць дзецям не пераядаць прадуктаў з высокім утрыманнем цукру і калорый, калі дарослыя пастаянна іх ядуць. Не падманвайце сябе дыетычнымі дэсертамі, яны могуць утрымліваць мала цукру, але шмат тлушчу. Аддавайце перавагу гародніне, злакам, зерневым і вотруб'ю.

**4. Перадменструальны сіндром.** Сярод агульных сімптомаў гэтага сіндрому — павышаны апетыт, жаданне з'есці што-небудзь салодзенькае. Спецыялісты рэкамендуюць ўжываць не больш за 30 г салодкага ў асабліва «крытычны» з вышэйзгаданага пункту гледжання дзень. Перамагчы цягу да салодкага можна з дапамогай наступнага рэцэпта. Разрэжце на кавалкі манга або ананас і падсмажце яго з невялікай колькасцю мёду. Зверху дадайце карыцы або какавы.

**5. Будзьце фізічна актыўнымі.** Фізічныя заняткі забяспечваюць кантроль за вагой цела, надаюць пачуццё актыўнасці, забяспечваюць выкід рэчываў, адказных за добры настрой, павялічваюць частату сардэчных скарачэнняў, у выніку чаго цела спальвае больш глюкозы і не назапашвае яе.

**6. Займайцеся сэксам.** Задавальненне запаўняе мозг эндарфінам — рэчывам, якое паступае ў кроў і распаўсюджвае эфект расслаблення на ўвесь арганізм. Людзі, якія вядуць рэгулярнае палавое жыццё, адрозніваюцца эмацыянальным балансам і іх менш цягне да салодкага. Акрамя таго, падчас сэксу спальваецца значная частка калорый.

**7. Ужывайце дастатковую колькасць вады.** Гэта таксама зніжае цягу да салодкага. 1,5-2 літры вады на дзень працягваюць пачуццё насычэння.

**8. Добры сон.** Чым менш вы спіце, тым больш нервуецеся. Сон спрыяе выслабаненню серataніну, які спрыяе добраму самаадчуванню і зніжэнню цягі да вугляводаў.

**9. Больш расслабляйцеся.** Чалавеку, які знаходзіцца ў стане стрэсу, неабходна больш «паліва». Замежныя даследчыкі заўважылі, што людзі, якія займаюцца медытацыямі, лепш спраўляюцца з неспрыяльнымі сітуацыямі і лепш пераносяць стрэс, а значыць, ім патрэбна менш цукру. Спакойнае ўспрыманне рэчаіснасці дазваляе збалансаваць і рэжым харчавання.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Як не разгубіцца ва ўмовах крызісу?

**У Мінску пад эгідай Белаграпрамбанка прайшла міжнародная канферэнцыя на тэму «Рознічныя банкаўскія паслугі: тэндэнцыі і перспектывы».**

Яе мэта — абмеркаваць праблемы банкаўскай дзейнасці, абмяняцца вопытам, сумесна выпрацаваць тактычныя і стратэгічныя накірункі развіцця на бліжэйшую і далёкую перспектыву. Актуальнасць канферэнцыі ў тым, што яна адбылася ў час, калі планету ахапіў сістэмны фінансавы крызіс. У пэўным сэнсе ён стане экзаменам для айчынных банкаў. Невыпадкова да выступоўцаў і дакладчыкаў былі шматлікія пытанні наконт магчымых наступстваў крызісу.

На думку старшыні Савета аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леаніда Заікі, які выступіў з цікавым і змястоўным дакладам-ацэнкай спажывецкага рынку краіны, Беларусь яшчэ не ўвайшла ў крызіс. Але ўжо цяпер банкам трэба выпрацаваць адэкватныя меры, каб потым не прыйшлося працаваць у аўральным рэжыме.

Нагадаем, такая канферэнцыя ўжо трэці раз запар праводзіцца па ініцыятыве Белаграпрамбанка, адной з самых аўтарытэтных сярод розных катэгорый кліентаў крэдытна-фінансавай структуры. Дарэчы, банк невыпадкова займае першае месца ў краіне па памерах уласнага капіталу, на працягу апошніх гадоў уваходзіць у лік 1000 буйнейшых банкаў свету.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности**

Аукцион состоится **25 ноября 2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

**Организатор аукциона:** фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62.

**Продавец недвижимого имущества:** республиканское унитарное предприятие «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», 212029, г. Могилев, пр. Пушкинский, 69, тел. 8(0222)453576.

| № лота | Наименование объектов | Место-нахождение объектов | Краткая характеристика объектов | Начальная цена продажи объектов, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. | Площадь земельного участка, га |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение общей площадью 46,5 кв.м (первый этаж), изолированное помещение общей площадью 36,0 кв.м (второй этаж), изолированное помещение общей площадью 924,4 кв.м (третий этаж), изолированное помещение общей площадью 924,8 кв.м (четвертый этаж) | г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а | Изолированные помещения в 4-этажном здании. Фундамент – бетонный, стены – крупнопанельные, перекрытия – железобетонные, полы – бетонные, крыша – совмещенная. | 1 090 125,0 | 100 000,0 | 0,1828 |

Объекты продаются в собственность без условий.

Имеется решение об отводе земли. Окончательное решение об отводе земли новому собственнику принимается Могилевским горисполкомом.

Задатки перечисляются на расчетный счет № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050 фонда «Могилевоблимущество».

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 29 июля 2008 г.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата за объекты осуществляется денежными средствами по безналичному расчету. Условия оплаты – разовый платеж.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к.104. Последний день подачи заявок 21 ноября 2008 г. Заключительная регистрация участников аукциона 25 ноября 2008 г. с 14.00 до 14.50. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни с 8 до 17 часов.

**Контактные телефоны: 223375, 311185.**

*Несвижский районный исполнительный комитет*

## 27 ноября 2008 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, продавец Несвижский сельский исполнительный комитет:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, д. Заозерье, ул. Приозерная, 17 624283502601000305 | 0,1358 | Газ, водопровод, электричество | 10 000 000 | 1 000 000 |

**Аукцион состоится 27.11.2008 г. в 11.00 в здании Несвижского районного исполнительного комитета: г. Несвиж, ул. Советская, 1.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни по 26.11.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, кабинет 312.** При подаче документов граждане, представитель граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на р/с 3642200070020 в филиале № 620 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж УНП 600038472, назначение платежа 04901, Несвижский районный исполнительный комитет.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения. Иные обязанности победителя аукциона, и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Контактный телефон (8 01770) 5 48 65,** (моб. 6152111)

*Несвижский районный исполнительный комитет*

## 27 ноября 2008 г. ПРОВОДИТ:

**открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса (кафе и гостиница);**

**открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания магазина непродовольственных товаров**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер, арендодатель | Площадь земельного участка | Срок аренды, лет | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Минская обл., Несвижский р-н, 132 км автомобильной дороги Р-11 Поречаны–Новогрудок–Несвиж, 624200000001000160, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 1,0000 га | 51 | 5 350 020 | 535 000 |
| 3 | Минская обл., г. Несвиж, ул. Садовая, 30А, 624250100001003900, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 0,0921 га | 51 | 8 777 788 | 877 780 |

**Аукцион состоится 27.11.2008 г. в 11.00 в здании Несвижского районного исполнительного комитета: г. Несвиж, ул. Советская, 1.**

При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.11.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, кабинет 312.**

Задаток перечисляется на р/с 3642200070020 в филиале № 620 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж УНП 600038472, назначение платежа 04901, Несвижский районный исполнительный комитет.

Участник, ставший победителям аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации; не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещения расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации заключить договор аренды земельного участка.

Иные обязанности победителя аукциона и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Контактный телефон (8 01770) 5 48 65,** (моб. 6152111)

## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**16 декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит открытый аукцион**

по продаже объектов республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания – единый предмет аукциона с установлением начальной цены продажи объектов, равной одной базовой величине

**На аукционные торги выставляется:**

| Сведения о капитальных строениях и их местонахождении. Продавец недвижимого имущества | Основные характеристики объекта | Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания объекта, га | Срок аренды земельного участка, лет | Начальная цена предмета аукциона (объект недвижимости + право аренды земельного участка), руб. | Сумма задатка предмета аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ 1.** Капитальное строение (производственное здание № 1 – котельная (инв. № 614/С-18678), расположено в п. Зеленый Бор Смолевичского района Минской области Производственное республиканское унитарное предприятие **«Зеленоборское»**, тел. (8 01775) 25 671, 25 650 | Здание одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша рубероидная, полы бетонные, инженерные коммуникации отсутствуют. Общая площадь 164,6 кв.м. Год постройки 1952 | 0,4047 Арендодатель: Смолевичский райисполком. Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1 000 Вольт | 99 | Одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона / 23 993 650 | 2 000 000 |
| **ЛОТ 2.** Капитальное строение (производственное здание № 3 – пожарное депо (инв. № 614/С-18680), расположено в п. Зеленый Бор Смолевичского района Минской области. Производственное республиканское унитарное предприятие «Зеленоборское», тел. (8 01775) 25 671, 25 650 | Здание одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша металл, рубероид, полы бетонные, инженерные коммуникации отсутствуют. Общая площадь 497,4 кв.м. Год постройки 1952 | 0,1158 Арендодатель: Смолевичский райисполком | 99 | Одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона / 2 633 000 | 250 000 |

Направления использования земельных участков (Лот 1 и Лот 2): для размещения объектов общественного, жилого, административного, физкультурно-оздоровительного назначения (решения Смолевичского райисполкома от 3 ноября 2008 г. № 2781 и № 2782).

**Условия участия в аукционных торгах:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание покупателем не менее 2-х рабочих мест; запрещена продажа покупателем, иное отчуждение объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**К участию в аукционных торгах допускаются** негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, заявление на участие в аукционе по форме, со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**1. Смолевичский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.**

**2. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.**

**3. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона не позднее 12 рабочих дней с даты проведения аукциона.**

Порядок проведения аукциона определен Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108 и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09, 500 45 08. Последний день подачи заявок 12 декабря 2008 г. до 13.00.**

## ААТ «ЛІДСКІ МАЛОЧНА-КАНСЕРВАВЫ КАМБІНАТ»:

# ЯКАСЦЬ ГАРАНТАВАНА

***Чытачы нашай газеты з гэтым прадпрыемствам добра знаёмыя, таму мы не будзем паўтарацца, а толькі напомнім, што Лідскі малочна-кансервавы камбінат быў здадзены ў эксплуатацыю 56 гадоў таму і на працягу гэтага перыяду пастаянна расшыраўся, былі праведзены рэканструкцыі. Сёння камбінат — сучаснае прадпрыемства, якое выпускае шырокі асартымент прадуктаў з малочнай сыравіны.***

***Калектыў ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат» сардэчна віншуе работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу з прафесійным святам!***

*Паважаныя калегі! Жадаем вам моцнага здароўя, аптымізму, добрага настрою, дабрабыту і новых працоўных поспехаў!*

Штодня перад камбінатам выстройваецца чарга аўтацыстэрнаў з малаком, а гэта значыць, што прадпрыемства працуе. Яно можа прыняць на перапрацоўку да 600 тон малака ў суткі, а асартымент выпускаемай прадукцыі налічвае больш за 70 відаў. Асноўную масу складаюць сухія малочныя прадукты: малако сухое натуральнае — 25 % тлушчу, малако сухое абястлушчанае — 1,5 % тлушчу, сухія вяршкі — 42 % тлушчу. А за год на камбінаце вырабляецца да 10 тысяч тон сухіх кансерваў, большая частка якіх ідзе на экспарт.

— Наша прадпрыемства выпускае бяспечную высакаякасную прадукцыю, якая адпавядае ўсім заканадаўчым і спажывецкім патрабаванням, — зазначыў дырэктар ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат» Уладзімір БЛАГАВЕШЧЫК.

І ў кіраўніка прадпрыемства ёсць важкія падставы для такога меркавання. На камбінаце падтрымліваецца высокая культура вытворчасці, прадухіляюцца небяспечныя фактары, якія ўплываюць на якасць прадукцыі. Ды і тое, што Лідскі малочна-кансервавы займае лідзіруючыя пазіцыі на беларускім і замежным рынках — сведчанне гэтага.

Малочныя прадукты прадпрыемства карыстаюцца попытам не толькі ў сваім раёне, яны запатрабаваныя ў Гродне і Мінску, ды і тое, што пастаянна растуць іх аб'ёмы, пра многае гаворыць.

Каб выжыць і выстаяць у канкурэнтнай барацьбе за рынак неабходна клапаціцца і аб абнаўленні асартыменту выпускаемай прадукцыі.

— У нас для гэтага многае робіцца, — паведаміла начальнік цэха натуральнамалочнай прадукцыі Святлана НАСЕВІЧ. — Сёлета мы пачалі вырабляць клінковы сыр з кменам, творог зярнёны ў кантэйнерах, кефір абястлушчаны і малако адналрацэнтнае.

А зараз паглядзім больш уважліва на малочныя прадукты Лідскага малочна-кансервавага камбіната.

Наколькі карысна для чалавека малако — пра гэта і расказваць не трэба — праверана тысячагоддзямі, але тут будзе цікавым адзін гістарычны факт.

У Швецыі ў свой час злачынцам, прыгавораным да смяротнага пакарання, давалі магчымасць выбару. Прыгавораны мог выбіраць паміж ежай і пітвом. Але, што б ён ні выбіраў, канец быў адзін — смерць. Такое пакаранне практыкавалася да той пары, пакуль адзін з прыгавораных да смерці не выбраў малако. Ішлі гады, а чалавек піў малако і не паміраў. Пасля гэтага пакаранне такім спосабам было адменена.

Як бачым, словы на фірменным знаку прадпрыемства «Малако п'ём — доўга жывём» маюць пад сабой аснову.

Гэты выпадак сведчыць, што ў малацэ ёсць усе кампаненты для жыцця чалавека. Вядома, што і прадукты на аснове малака таксама карысныя для нашага арганізма. Вось возьмем, напрыклад, кісламалочныя прадукты, якія выпускае малочна-кансервавы камбінат.

*Укладчыцы Анжэла МАРАЧЫЛА, Марыя КАРАНЕЎСКАЯ і грузчык Валерый САДОЎСКІ.*

Біфідакефір «Троіцкі» вырабляецца з сумесным прымяненнем кефірнай закваскі і канцэнтрату біфідабактэрый. Гэты прадукт спрыяе падаўленню актыўнасці гніласных і іншых патагенных бактэрый. «Троіцкі» актывізуе дзейнасць страўніка, узбуджае апетыт, спрыяльна ўплывае на мікрафлору кішэчніка, падтрымлівае высокі ўзровень імунітэту..., а гэта ўжо нямала.

Яшчэ адзін прадукт, які ўтрымлівае біфідабактэрыі, — «Біфідабакт». Ён мае прыемны асвяжальны смак і водар. Гэты прадукт лічыцца найлепшай лячэбна-прафілактычнай дабаўкай для дзяцей і дарослых.

Лекавымі ўласцівасцямі валодае і біфідаёгурт «Сандра». Біфідабактэрыі, якія ёсць у ім, разбураюць таксічныя прадукты, сінтэзуюць вітаміны групы В, С і фоліевую кіслату, дзякуючы гэтаму «Сандра» аднаўляе і падтрымлівае імунны статус арганізма чалавека. А фруктовыя напаўняльнікі (вішня, маліна, клубніцы, персік) прыдаюць ёгурту прыемны смак і пах.

Дарэчы, біфідаёгурт «Сандра» можна захоўваць 10 сутак, а «Біфідабакт» і «Троіцкі» маюць тэрмін захоўвання 5 сутак. Такое працяглае захоўванне звязана з высокай ступенню ачысткі малака ад пабочных прымесяў, забруджвання і мікраарганізмаў.

Адыгрывае ролю і ўпакоўка. Ёгурт і «Біфідабакт» фасуюцца ў пакеты «Фінпак», а біфідакефір «Троіцкі» — у пакеты «Тэтра Рэкс». Прадукцыя ў такой упакоўцы найбольш канкурэнтаздольная па цане, зручная для спажыўца і транспарціроўкі на вялікія адлегласці.

Неабходна звярнуць увагу і на прадукты, якія карыстаюцца штодзённым попытам у нашых пакупнікоў.

Малако «Смачнае» і пітное вырабляецца з натуральнага малака без кансервантаў і дабавак. А вось пастэрызаванае вітамінізаванае малако «АСДЕ» — з нармалізаванага малака з дабаўкай вітаміннага комплексу А-С-Д-Е, што дапамагае чалавеку абараніць сябе ад розных захворванняў.

*Начальнік цэха натуральнамалочнай прадукцыі Святлана НАСЕВІЧ і спецыяліст па маркетынгу Наталля ТЫШКЕВІЧ.*

Масла «Сялянскае» атрымліваецца з пастэрызаваных вяршкоў шляхам іх збівання. Карыстаецца славай найлепшага харчовага тлушчу і прызначана для непасрэднага ўжывання ў ежу.

*Начальнік аддзела маркетынгу і збыту Алена АМБРОС верыць у перспектыву.*

Сыр «Добрай раніцы» вырабляецца з творагу з дабаўленнем натуральных духмяных рэчываў шляхам плаўлення сумесі.

А хіба ўвагу пакупнікоў не прыцягваюць маянэз правансаль «Салатны» і «Сталічны»?! Даспадобы ім прыйшліся ёгурт «Таптышка» і творог з фруктамі. А яшчэ ёсць ражанка, малако згушчанае «Беларускае», сырок з разынкамі і курагой... — асартымент у Лідскага малочна-кансервавага камбіната салідны.

Але сёння, калі ў свеце пануе фінансавы крызіс, калі Расія ўводзіць абмежаванні для многіх беларускіх прадпрыемстваў, якія выпускаюць малочныя прадукты, ці ёсць магчымасць у камбіната, як раней, рэалізоўваць сваю прадукцыю?

На гэтае пытанне адказала Алена АМБРОС, начальнік аддзела маркетынгу і збыту.

— Нягледзячы на ўсе знешнія негатыўныя з'явы, якія ўплываюць і на работу нашага прадпрыемства, мы стараемся пашыраць рынак для нашай прадукцыі. Акрамя Расіі мы экспартуем малочныя прадукты і ў іншыя краіны. Вось у Казахстан паставілі 500 тон сухога абястлушчанага малака, затым яшчэ 300 тон, ёсць напрацоўкі з Азербайджанам, Арменіяй і Грузіяй, імкнёмся выйсці на рынкі Ірана і Венесуэлы. Літаральна ў пачатку лістапада ў Арабскіх Эміратах праходзіла выстава беларускіх тавараў і наш камбінат у гэтай краіне дэманстраваў сваю прадукцыю. Мы былі адным з трох прадпрыемстваў у сваёй галіне. Працуем, шукаем выйсце і думаем, што бязвыхадных сітуацый няма, бо малочныя прадукты будуць заўсёды запатрабаваныя.

Прадукцыю ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат» ведаюць у Сінгапуры, Францыі, Польшчы, Германіі, Японіі...

З прыходам на прадпрыемства Уладзіміра Благавешчыка апошнім часам тут адбыліся станоўчыя зрухі і пра гэта сведчаць шматлікія ўзнагароды.

Многа разоў прадукцыя камбіната адзначалася дыпломамі «Лепшая прадукцыя года». На конкурсе «Прадукт года-2007», які праходзіў у рамках выставы «World food» Масква-2007» прадукцыя прадпрыемства была ўдастоена залатога, сярэбранага і бронзавага медалёў. У лістападзе 2007 года на выставе «Peterfood-2007» на конкурсе «Наша марка» — залаты і сярэбраны медалі. У маі 2008 года ў рамках выставы «Усерасійская марка (III Тысячагоддзе). Знак якасці XXI стагоддзя» ўсе пяць узораў прадукцыі, выстаўленых на конкурс, атрымалі залатыя медалі.

Не засталіся па-за ўвагай малочныя прадукты і на 10-й міжнароднай выставе ў г. Алматы. Там на конкурсе «Лідар Прадуктовага рынку Казахстана» прадукцыя камбіната атрымала «золата».

**Матэрыял падрыхтавалі:**
**Сымон СВІСТУНОВІЧ,**
**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі аўтараў.**
**УНП 500016587**

**ААТ «ЛІДСКІ МАЛОЧНА-КАНСЕРВАВЫ КАМБІНАТ» ЗАПРАШАЕ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА.**

231300, Гродзенская вобласць,
г. Ліда, вул. Энгельса, 116
тэл./факс —
8 (01561) 2 33 56, 2 12 44.
E-mail: mkk@mail.lida.by
www.moloko.lida.by

# Эканоміка Васіля Густыра:

# БОЛЬШ, АЛЕ НЕ ЛЮБОЙ ЦАНОЙ

*Новыя дамы ў пасёлку.*

***Ці мог тры дзесяцігоддзі таму нехта з работнікаў тады яшчэ саўгаса «Свіслач», зусім не лепшай гаспадаркі Гродзенскага раёна спрагназаваць цяперашнія вынікі і ў раслінаводстве, і ў жывёлагадоўлі? Такога аптыміста, пэўна, палічылі б жартаўніком. А сёння чарговыя дасягненні і ва ўраджайнасці збожжа, і ў нарыхтоўцы кармоў, і па надоях малака — гэта ўжо як норма. Але пры гэтым колькасныя паказчыкі для заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь Васіля ГУСТЫРА — зусім не самамэта. Рэкорды любой цаной «Свіслачы» не патрэбныя.***

## У СВК «Свіслач» ставяць чарговыя рэкорды, але не збіраюцца спачываць на лаўрах

### «Калі правільна адчуваць зямлю...»

СВК «Свіслач» — гэта адна з нямногіх гаспадарак вобласці і рэспублікі, якая можа весці пашыранае ўзнаўленне за кошт уласных сродкаў, не карыстаючыся дзяржаўнай датацыяй. Бальнасць сельгасугоддзяў — 40,7, не самая высокая ў краіне. У чым жа аснова вытворчых поспехаў? На гэта пытанне Васіль Мікалаевіч адказвае проста: «Працуем нармальна — адсюль і вынік».

Заўважце, старшыня лічыць работу свайго калектыву нармальнай, але не выдатнай, паколькі бачыць рэзервы, напрыклад, у скарачэнні расходу паліва і электраэнергіі на адзінку прадукцыі. Ды і ў раслінаводстве таксама, хоць і склала сёлета сярэдняя ўраджайнасць хлебных палеткаў каля 85 цэнтнераў з гектара.

Дарэчы, разлік быў на тое, каб атрымаць не менш за 100 цэнтнераў з гектара. І хто ў маі — пачатку чэрвеня бачыў гэтыя палі — быў проста ў захапленні ад ураджаю, які фарміруецца ў «Свіслачы». Аднак... Літаральна за адну ноч на тэрыторыю гаспадаркі выпала 34 міліметры ападкаў, праз суткі — зноў лівень, яшчэ 20 мм. Для тутэйшых суглінкаў гэта ўжо быў яўны перабор. Хоць і апрацоўвалі ўсе азімыя ад палегласці, але збожжа было такое, што колас проста не мог вытрымаць удару стыхіі.

І тым не менш, хоць і не дасягнулі чаканай ураджайнасці, але крок наперад усё роўна зроблены. Цяпер у гаспадарцы праводзяць, скажам так, «працу над памылкамі»: ці аптымальнай была норма высеву? Наколькі збалансавана ўносіліся розныя віды ўгнаенняў?

— Мы зразумелі, што атрымаць 100 цэнтнераў збожжа з гектара можна. І прыклад СВК «Прагрэс-Верцялішкі» — яскравае таму пацвярджэнне, — зазначае Васіль Густыр. — Калі правільна адчуваць зямлю, фазу развіцця раслін, разумець, што ім патрэбна менавіта ў гэты перыяд, то наступствы любой стыхіі будуць звезджены да мінімуму. Пры гэтым да любой вытворчасці трэба падыходзіць не з «валавых» пазіцый, «працэнтнага» росту, а з пункту гледжання эфектыўнай эканомікі, суадносінаў паміж затратамі і вынікам.

Такі аналіз у «Свіслачы» робіцца ў кожнай вытворчай галіне. Скажам, вынікі жніва ацэньваюцца, перш за ўсё, зыходзячы з рэнтабельнасці збожжавых культур, якая сёлета склала 70 працэнтаў — вышэй, чым летась. А кукуруза французскага гатунку паказала сябе так цудоўна, што ў часы Мікіты Сяргеевіча быць, пэўна, свіслацкім спяцам з самымі высокімі ўзнагародамі. Ураджайнасць сіласнай масы — 480 цэнтнераў, а збожжа — 157 цэнтнераў з гектара, лепшы паказчык у рэспубліцы.

Дык што, і іншым фарміраваць кармавую базу жывёлагадоўлі з упорам менавіта на кукурузу? Аднак Васіль Мікалаевіч папярэджвае калег, што захапляцца ёй... асабліва не варта. Затраты такія, што калі атрымліваць з гектара ўсяго 300 цэнтнераў сіласнай масы і менш за 120 цэнтнераў збожжа, то лепш сеяць не кукурузу, а травы.

*Старшыня СВК «Свіслач» Васіль ГУСТЫР.*

Падобныя разлікі — і па іншых напрамках вытворчасці. Цукровыя буракі сёлета далі таксама рэкордны ўраджай — 804 цэнтнеры з гектара. Гэта значыць, што з кожнага гектара атрымалі 124 цэнтнеры чыстага цукру. Лідзіруе «Свіслач» і па ўраджайнасці бульбы — 550 (!) цэнтнераў з гектара. А яшчэ адзін рэкордны паказчык — у вытворчасці малака на 100 гектараў сельгасугоддзяў. Паводле разлікаў, кожны гектар зямлі сёлета «дасць» 2 тоны малака, упершыню ў гісторыі Гродзеншчыны. Надой ад кожнай каровы па выніках года павінен скласці 7300 кілаграмаў — другі паказчык у вобласці пасля суседзяў з СВК «Кастрычнік-Гродна».

Але і тут Васіль Густыр далёкі ад нейкай эйфарыі. На яго думку, можа скласціся сітуацыя, калі малако будзе ў рэспубліцы лішнім, у тым сэнсе, што аб'ёмы вытворчасці значна перавысяць запыты нашага ўнутранага рынку. А павялічыць экспартныя пастаўкі вельмі няпроста, для гэтага трэба, перш за ўсё, паляпшаць якасныя паказчыкі малочнай прадукцыі, каб яна сапраўды адпавядала экстра-класу.

Становішча на рынку агародніны таксама няпростае. Скажам, у мінулым годзе капуста была ў дэфіцыце, кілаграм у гэты перыяд каштаваў 500 рублёў. Сёлета ж, калі ў гэтай «нішы» паспрабавалі атрымаць выгаду і іншыя вытворцы, нарыхтоўшчыкі купляюць удвая танней. А налета, калі нехта капусту не пасадзіць, сітуацыя, не выключана, зноў кардынальна зменіцца.

Аднак у любым выпадку ў выйгрышы будзе той, хто зможа не толькі ў сезон нарыхтовак, але і пазней прапанаваць якасную прадукцыю. З гэтай мэтай і пабудавалі ў «Свіслачы» сучаснае агароднінасховішча. Аптовыя пакупнікі могуць не сумнявацца, што тут забяспечаны ўсе неабходныя ўмовы для захоўвання той жа капусты і іншай агародніны. У чым, дарэчы, ужо даўно пераканаліся пастаянныя кліенты фірменнага магазіна СВК «Свіслач» па вуліцы Савецкіх пагранічнікаў у абласным цэнтры. Едуць сюды атаварвацца з усяго горада, паколькі прадукцыя якасная (магазін аснашчаны самым сучасным абсталяваннем) і, да таго ж, наўрад ці дзе купіш танней тую ж агародніну. У шырокім асартыменце збожжавыя і зернебабовыя для прысядзібнай гаспадаркі — ячмень, пшаніца, трыцікале, авёс, кукуруза, гарох... Ды і малочнай прадукцыі штомесяц прадаецца на 50-60 мільёнаў рублёў.

### Прыём па асабістых пытаннях — штодня

Шыльда на дзвярах службовага кабінета Васіля Густыра сведчыць, што па асабістых пытаннях ён прымае не ў пэўныя дні рабочага тыдня, а штодня. Цеснаму кантакту старшыні з людзьмі садзейнічае і, можна сказаць, аптымальная плошча гаспадаркі — 2900 гектараў сельгасугоддзяў. Паколькі небяспека «гігантаманіі» ў тым, што можа пагоршыцца не толькі аператыўнасць у вырашэнні тых ці іншых пытанняў, але і, скажам так, чалавечы складнік жыцця калектыву, калі работнік, пенсіянер гадамі не бачаць кіраўніка гаспадаркі.

Васіль Мікалаевіч, дарэчы, часта бывае не толькі ў вытворчых падраздзяленнях гаспадаркі, але і ў мясцовай школе. Нядаўна праводзілі там «Дзень ураджаю». Лепшым вучням, у каго па выніках першай чвэрці сярэдні бал склаў васьмёрку і вышэй, сельгаскааператыў выплаціў прэмію ў памеры трох базавых велічынь. Узнагародзілі і школьнікаў, якія працавалі ў збожжасховішчы. Хто адпрацаваў 25 дзён — атрымаў прэмію 50 тысяч, больш за 30 дзён — 70 тысяч рублёў. Гэта дадаткова да зарплаты, якая дасягала 500-600 тысяч рублёў.

Дарэчы, гэту працоўную школу прайшоў падчас канікулаў і ўнук старшыні Раман. Але не ўсім ахвотным маглі даць такую магчымасць, паколькі дзяцей, якім не споўнілася 14 гадоў, браць на работу нельга. Лодарнічаць — можна, а атрымліваць першыя працоўныя навыкі, зразумела, пад пільным наглядам дарослых цяперашнім заканадаўствам не дазваляецца. Хіба ж гэта разумна? Альбо якая логіка ў тым, што раней навучэнцы школы маглі атрымаць правы трактарыста, а цяпер такой магчымасці не існуе? Як пры падобных абмежаваннях павышаць прэстыж сельскагаспадарчых прафесій?

— Калі з дзяцінства не працаваць, то і да старасці не навучышся, — лічыць Васіль Густыр. — Між тым галоўная праблема ў вёсцы — гэта кадры. Яна існавала заўсёды, але з кожным годам будзе ўсё больш вострай, асабліва што датычыцца механізатараў, жывёлаводаў. Ды і спецыялістаў таксама, паколькі далёка не ўсе выпускнікі ВНУ, нягледзячы на розныя меры па кантролі за працаўладкаваннем, атрымліваюць дыплом дзеля таго, каб працаваць у сельскай гаспадарцы.

А той, хто не пабаяўся цяжкасцяў і звязаў свой лёс з зямлёй, прынамсі, у «Свіслачы», не шкадуе. Усе механізатары і жывёлаводы жывуць у кватэрах з гарадскімі выгодамі — халодная і гарачая вада, ацяпленне, каналізацыя, цэнтралізаваны вываз смецця... Тыя ж умовы, што і ў горадзе, толькі, скажам так, больш паветра, свабоды. У 2006 годзе пабудавалі тры двухкватэрныя дамы, у мінулым — два чатырохкватэрныя, а сёлета — адзін чатырохкватэрны і будуюцца яшчэ чатыры дамы прысядзібнага тыпу. Чаргі практычна няма, а толькі на паляпшэнне жыллёвых умоў. Дзіцячы садок, сярэдняя школа, магазіны, нармальныя дарогі, цэнтр пасёлка газіфікаваныя... У фельчарска-акушэрскім пункце, які пабудаваны, а нядаўна рэканструяваны за сродкі гаспадаркі, ажно 12 фізіятэрапеўтычных апаратаў, аказваецца акушэрская, стаматалагічная дапамога.

Безумоўна, не без праблем. У прыватнасці, вяскоўцы не ў захапленні ад таго, што іх замацавалі за паліклінікай абласнога цэнтра і лічаць, што яны не ў роўных умовах з гараджанамі, што сітуацыя з медыцынскім абслугоўваннем у параўнанні з раённай паліклінікай зусім не палепшылася, а нават пагоршылася. А калі так, то, можа, адпаведным кіраўнікам варта сустрэцца з людзьмі, пацікавіцца іх меркаваннямі?

...Перш чым азнаёміцца з новымі аб'ектамі гэтага года (агародніна сховішча, дзве вежы для захоўвання збожжа на тысячу тон кожная), цікава было даведацца, а як жа развіваецца яшчэ адзін свіслацкі праект. Летась «Звязда» расказвала аб адкрыцці музея СВК «Свіслач» і, аказваецца, з таго часу ён папоўніўся новымі экспанатамі і прыняў шмат наведвальнікаў, у тым ліку з іншых рэгіёнаў вобласці і рэспублікі.

Зрэшты, музей ствараўся перш за ўсё для мясцовых жыхароў. Каб яны ведалі свае карані — гісторыю тутэйшых вёсак, гаспадаркі, людзей, якія імкнуліся годна жыць на гэтай зямлі, прадметы побыту, якімі яны карысталіся...

У адрозненне ад іншых спраў у «Свіслачы», няма ў гэтай задуме нейкай эканамічнай матывацыі. Але ёсць галоўнае — павага да сваёй спадчыны, шчырае жаданне наладзіць «мосцік» паміж учарашнім, сённяшнім і заўтрашнім днём родных сэрцу мясцінаў.

**Матэрыял падрыхтавалі**
**Барыс ПРАКОПЧЫК,**
**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**
**УНП 500027281**

*У музеі гаспадаркі — адзін з яго арганізатараў, намеснік старшыні сельгаскааператыва па ідэалагічнай рабоце Тадэвуш ШЫДЛОЎСКІ.*

*Вадзіцель Леанід ШЫДЛОЎСКІ дастаўляе прадукцыю ў фірменны магазін.*

*У фельчарска-акушэрскім пункце.*